Міліцыянеры лепшыя ў футболе

СТАР. 3

АЭС: праверка на бяспеку

СТАР. 4

Універсальная вакцына ад грыпу?

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

29 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. СЕРАДА № 206 (27816) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Тры зорныя волаты

VI Беларускі касмічны кангрэс, які адкрыўся ўчора ў Мінску, сабраў вядучых спецыялістаў касмічнай галіны з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Кыргызстана, іншых краін. На мерапрыемства прыехалі і тры лётчыкі-касманаўты, якія па праве лічаць Беларусь сваёй Радзімай, — Алег НАВІЦКІ, Уладзімір КАВАЛЁНАК і Пётр КЛІМУК.

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ТУЗІКАЎ, генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі:

«Новая беларуская касмічная праграма ўжо распрацавана і знаходзіцца на разглядзе ў Савеце Міністраў. Беларусь цяпер канцэнтруе ўвагу на некалькіх касмічных кірунках. Адзін з іх — тэхналогіі зандзіравання зямлі. У нас ужо ёсць пэўны вопыт у гэтай сферы. І дзякуючы гэтаму мы сталі членамі Камітэта ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах. Акрамя таго, цяпер актуальнымі з'яўляюцца пытанні касмічнай сувязі, навігацыі і адукацыі ў адпаведнай галіне. Важнае значэнне мае і распрацоўка адзіных стандартаў. Праграма стандартызацыі ў гэтым годзе таксама завяршаецца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2014 г.

Долар ЗША	10700,00	■
Еўра	13600,00	▲
Рас. руб.	252,50	▼
Укр. грыўня	823,08	■

УЗРОВЕНЬ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Беларусь надае важнае значэнне развіццю супрацоўніцтва з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі і бачыць істотны патэнцыял для яго нарошчвання. Пра гэта ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з наследным прынцам эмірата Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі сіламі ААЭ, шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам, паведамляе БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Падчас сустрэчы, якая доўжылася больш за дзве гадзіны, былі абмеркаваны як бягучыя праекты, так і вызначаны задачы на бліжэйшую перспектыву.

Аляксандр Лукашэнка і шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян далі даручэнні вызначыць 3-4 ключавыя праекты, рэалізацыя якіх дазволіла б вывесці адносіны паміж дзвюма краінамі на якасна новы ўзровень.

Бакі з задавальненнем адзначылі станоўчыя вынікі другога пасяджэння сумеснага камітэта па супрацоўніцтве паміж урадам Беларусі і ўрадам ААЭ.

ААЭ з'яўляюцца асноўным гандлёвым партнёрам Беларусі сярод арабскіх дзяржаў Персідскага заліва. Асноўнымі пазіцыямі беларускага экспарту ў ААЭ з'яўляюцца часткі для аўтамабіляў і трактароў, тытунёвыя вырабы, сінтэтычныя валокны, рухавікі і сілавыя ўстаноўкі, калійныя ўгнаенні, падшыпнікі, прычэпы і паўпрычэпы. Па стане на 2013 год у Беларусі было зарэгістравана 14 арганізацый з удзелам эмірацкага капіталу і прыцягнута інвестыцый з ААЭ на суму $54 млн.

Беларусь і ААЭ адрозніваюць высокі ўзровень палітычнага ўзаемадзеяння. Пазіцыі дзвюх краін супадаюць па ключавых пытаннях міжнароднага парадку дня, якія разглядаюцца ў ААН.

СУПРАЦОЎНІЦТВА З МВФ — ДЛЯ МІЖНАРОДНАГА ІМІДЖУ

Аднак фінансавая дапамога ад фонду таксама была б да месца

Скончылася чарговая місія Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусі. Былі праведзены сустрэчы з шэрагам кіраўнікоў ключавых ведамстваў. Заключным этапам місіі стала сустрэча з прэм'ер-міністрам Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ. Кіраўнік беларускага ўрада і кіраўнік місіі МВФ Дэвід ХОФМАН вялі размову ў адным рэчышчы, з чаго можна зрабіць выснову аб агульнай зацікаўленасці ў новай краінавай праграме з фондам. Праўда, абодва бакі чакаюць адзін ад аднаго канкрэтных дзеянняў.

НАДЗВЫЧАЙНАГА ФІНАНСАВАННЯ НЕ ТРЭБА

Пра гэта заявіў Міхаіл Мясніковіч і паведаміў, што Беларусь завершыць 2014 год з эканамічным ростам. Зразумелы і цалкам разлічаны прагноз плацежнага балансу на наступны год. «Праца з фондам нам, безумоўна, патрэбна і важная. Перш за ўсё з пункту гледжання міжнароднага іміджу і падтрымкі той праграмы структурных рэформаў, якія мы намецілі і рэалізуем разам з Нацыянальным банкам», — сказаў прэм'ер-міністр.

СТАР. 2

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

31 кастрычніка 2014 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ На ўсялякі выпадак

Бейсбольная біта — сродак самаабароны?

Гадоў дзесяць таму знаёмая жанчына халодным восеньскім вечарам па дарозе дадому нечакана сустрэла... рабаўніка. Перацягвалі яе сумачку, нібы канат, да той пары, пакуль брэх сабакі не спужаў злодзея. Праз пэўны час у кішэні асцярожнай жанчыны надоўга пасяліўся газавы балончык. Падобныя выпадкі ў нашым жыцці здарыцца могуць у кожнага. Але чым абараняцца, пакуль не прыехала міліцыя? Колькі каштуюць сродкі самаабароны, і ці можна ў гэтых мэтах выкарыстоўваць агнястрэльную зброю? На гэтыя пытанні нам адказаў падпалкоўнік міліцыі Дзмітрый ЯЗЭПЧЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела ліцэнзійна-дазвальнай работы ўпраўлення прафілактыкі МУС.

— Востры неабходнасці набываць сродкі самаабароны ў нашай краіне няма, — кажа суразмоўца. — Па вялікім рахунку, крымінальнае становішча ў нас спакойнае, а таму падстаў для гэтага не існуе. Тым не менш той, хто хоча набыць, напрыклад, газавы пісталет, мусіць атрымаць навыкі абыходжання з ім, прайсці медкамісію. І толькі пасля гэтага ў тэрытарыяльных органах унутраных спраў вырашаць, ці можна грамадзяніну даць дазвол на набыццё зброі самаабароны.

СТАР. 3

■ Фінансавы выдатнік

ЧАС «ДАМАЎЛЯЦЦА» З КАРТКАЙ

Захоўвайце грошы ў віртуальным партманеце — калі, вядома, яны ў вас ёсць

Плацежныя карткі ўсур'ёз «уваходзяць» у наша жыццё. Дасведчаны трымальнік «пластыка» эканоміць шмат часу, калі самастойна ажыццяўляе львіную долю неабходных рэгулярных плацяжоў, з лёгкасцю набывае квіткі ў кіно ці ў тэатр, седзячы дома на канапе, не турбуецца аб захаванасці ўласных грошай і нават атрымлівае дадатковы даход, не прыкладаючы да гэтага ніякіх намаганняў.
Аднак далёка не ўсе ў нас выкарыстоўваюць магчымасці банкаўскай карткі па максімуме. Сёння мы пачынаем цыкл матэрыялаў аб безнаяўных разліках. Дапамагаць нам будзе вядомы эксперт па гэтай тэме — дырэктар Нацыянальнай плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ Аляксандр СОТНІКАЎ.

ВЫБІРАЕМ ПЛАЦЕЖНУЮ СІСТЭМУ

У класічным разуменні, плацежная сістэма — гэта сукупнасць правілаў, тэхналогій, методык разліку, унутраных і знешніх нарматыўных актаў, якія дазваляюць усім удзельнікам сістэмы ажыццяўляць фінансавыя аперацыі адзін з адным.

Цяпер у нашай краіне банкамі выпускаюцца пластыкавыя карткі трох плацежных сістэм: Белкарт, Visa і MasterCard. Карткі яшчэ адной плацежнай сістэмы — American Express — на тэрыторыі нашай краіны абслугоўваюцца, але пакуль не выпускаюцца (не эмітуюцца). Абслугоўваюцца ў Беларусі і карткі кітайскай аплатнай сістэмы China UnionPay.

Visa — міжнародная сістэма родам з ЗША. Першая транзакцыя карткай, эмітаванай на базе звыклага нам брэнда, была ажыццёўлена 26 ліпеня 1976 года. Сёння карткі Visa прымаюцца да аплаты ў гандлёвых пунктах больш 200 краін свету. У 2012 годзе на долю Visa прыходзілася каля 25% ад усіх эмітаваных у свеце плацежных картак — іх колькасць перавысіла 2 мільярды.

MasterCard — міжнародная плацежная сістэма, якая была заснавана таксама ў ЗША ў 1966 годзе, аднак сучасная назва сістэмы прынята ў 1979-м.

СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Польшча вырашыла ўзмацніць ваенную прысутнасць на ўсходзе краіны

Польшча збіраецца ўмацаваць свае ўсходнія межы (у напрамку Літвы, Беларусі і Украіны), накіраваўшы туды салдат і сучасную ваенную тэхніку. «Укамплектаванасць як мінімум трох ваенных баз на ўсходзе павялічыцца з цяперашніх 30% амаль да 90% да 2017 года», — заявіў віцэ-прэм'ер і міністр абароны краіны Томаш Семаняк. Прычына перадыслакацыі войскаў не ўтойваецца — бесперапынны канфлікт ва Украіне. Семаняк заявіў, што «геапалітычная сітуацыя змянілася» і «ў нас найбуйнейшы крызіс бяспекі з часоў «халоднай вайны». Сітуацыя ў суседняй дзяржаве, падкрэсліў ён, з'яўляецца «пагрозлівай».

У Эстоніі школьнік на ўроку застрэліў настаўніка

У школе эстонскага горада Вільяндзі, які знаходзіцца ў паўднёвай частцы краіны, адбылася страляніна. Як паведамляе газета Postimees, навучэнец 9-га класа падчас урока адкрыў агонь па настаўніку, у выніку чаго выкладчык загінуў. Школьніка затрымалі. На месца здарэння прыбылі паліцыя і «хуткая дапамога». У Вільяндзі адразу накіраваўся і міністр адукацыі Эстоніі Яўген Асіноўскі. Пазней стала вядома, што загінула 56-гадовая настаўніца нямецкай мовы. Таксама высветлілася, што вучань быў узброены пісталетам.

У Сноўдэна з'явіўся пераемнік

Супрацоўнікі ФБР абшукалі дом другога пасля Эдварда Сноўдэна падазронага ў перадачы сакрэтных даных журналістам, паведамляеYahoo News са спасылкай на крыніцы ў разведцы і праваахоўных органах. У прыватнасці, неназваны ўрадавы падрадчык падазраецца ў тым, што паведаміў анлайн-платформе The Intercept падрабязнасці аб спісах грамадзян, якіх амерыканскія ўлады падазраюць у сувязях з тэрарыстамі. У жніўні выданне апублікавала матэрыял, паводле якога больш за 40% з 680 тысяч асоб, унесеных у спіс падазраваных, не маюць ніякіх сувязяў з тэрарыстамі. Пры гэтым журналісты спасылаліся на дакумент, перададзены ім крыніцай у разведцы. Гэтыя даныя пазней сталі адным з пунктаў іскавай заявы Амерыканскага саюза абароны грамадзянскіх свабод да ўрада аб незаконнасці ўнясення людзей у спіс асоб, якім забаронена лятаць самалётамі. Дакументальны фільм «Citizenfour», выпушчаны ў кастрычніку, таксама дае зразумець, што Сноўдэн быў не адзінай крыніцай журналістаў. Супрацоўнікі амерыканскай разведкі асцерагаюцца, што Міністэрства юстыцыі не спяшаецца прад'яўляць афіцыйныя абвінавачанні выкрывальніку з-за асцярогі зноў падвергнуцца крытыцы з боку ліберальнай грамадскасці.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Грэцкія арэхі могуць выратаваць ад хваробы Альцгеймера

Пра гэта кажуць навукоўцы Інстытута Нью-Ёрка, піша Medical News Today. Экстракт грэцкага арэха валодае антыаксідантным эфектам супраць акіслянага стрэсу, выкліканага адкладаннямі бэта-амілоіднага бялку ў мозгу тых, хто пакутуе ад хваробы Альцгеймера. Навукоўцы праверылі, як рацыён, багаты на грэцкія арэхі, уплываў на здольнасці да навучання, арыентацыю ў прасторы, трывожнасць, рухальную каардынацыю ў мышэй. Аказалася, арэхі дазваляюць палепшыць усе паказчыкі. Сакрэт — у высокай канцэнтрацыі антыаксідантаў. Акрамя таго, у арэхах шмат альфа-ліналенавай кіслаты, карысная для сэрца і мозга. Раней спецыялісты таксама казалі, што арэхі і алей з грэцкіх арэхаў зніжаюць рызыку сардэчна-сасудзістых хвароб, паляпшаюць рэакцыю арганізма на стрэс.

КАРАТКА

Арганізацыі недзяржаўнага сектара эканомікі за дзевяць месяцаў 2014 года забяспечылі 69,4 працэнта паступленняў у кансалідаваны бюджэт Мінска.

Музыканты з дзевяці краін стануць удзельнікамі XL Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Беларуская музычная восень», які адбываецца з 28 кастрычніка па 27 лістапада. У праграме форуму не толькі разнастайныя жанры класічнай музыкі, але і фальклор, поп-музыка, джаз, прадстаўлена харэаграфічнае мастацтва.

З пачатку года камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама было ўзгоднена прыцягненне больш як 15 тыс. замежных грамадзян.

Арганізацыя «Ахова птушак бацькаўшчыны» да 15 снежня праводзіць акцыю па ахове ласося ад браканьераў і запрашае валанцёраў прыняць у ёй удзел. Для валанцёраў у Астравецкім раёне створаны спецыяльны базавы лагер, куды яны могуць прыязджаць на некалькі дзён.

■ Адданасць

«АД «ЗВЯЗДЫ» Я НІКОЛІ НЕ АДМАЎЛЯЎСЯ. І ЎЖО НЕ АДМОЎЛЮСЯ»

На пытанне, як даўно вы чытаеце «Звязду», людзі адказваюць, вядома ж, па-рознаму. Нехта — больш-менш канкрэтна: «Гадоў пяць ці дзесяць», нехта — вельмі прыблізна: «З канца сямідзясятых...», «З часоў перабудовы», «Усё жыццё... Бо газету выпісвалі яшчэ і бацькі»... Анатоль Канстанцінавіч ШКУТ з Мінска час называе дакладна. Ды што там — ён нават доказ можа прадставіць! Праўда, важыць той доказ кілаграмаў пад дзесяць... А гэта значыць, што без асаблівай патрэбы з кватэры яго выносіць не будзеш, за блізкі свет не павязеш. Іншая справа, калі едзеш у рэдакцыю — па выйграны прыз...

СТАР. 2

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2015 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведчага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

■ Наша пазіцыя

Паважаем выбар украінскага народа

Мы з павагай ставімся да выбару, зробленага ўкраінскімі грамадзянамі. Пра гэта гаворыцца ў каментарыі прэс-службы Міністэрства замежных спраў нашай краіны ў сувязі з правядзеннем ва Украіне пазачарговых парламенцкіх выбараў.

Згодна з заявай МЗС, Беларусь гатова працягнуць усебаковае канструктыўнае супрацоўніцтва са сваім суседам і садзейнічаць паспяховаму прадаўжэнню мірнага працэсу ва Украіне.

«Спадзяёмся, што новы парламент, выбраны ў гэтых складаных умовах, зробіць усё магчымае для аднаўлення паўнавартаснага агульнанацыянальнага дыялогу, захавання адзінства Украіны і далейшага паступальнага развіцця брацкай краіны, з якой Беларусь звязваюць стагоддзі агульнай гісторыі», — гаворыцца ў каментарыі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

СУПРАЦОЎНІЦТВА З МВФ — ДЛЯ МІЖНАРОДНАГА ІМІДЖУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Беларусі разлічваюць, што далейшая праца з МВФ дазволіць нарасціць аб'ёмы, маштабы структурных рэформаў і скараціць тэрміны іх рэалізацыі. Для беларускага боку вельмі важная канкрэтыка ў адносінах з Міжнародным валютным фондам. У 2009 і 2010 гадах Беларусь атрымала па праграме стэнд-бай МВФ 3,4 млрд доларaў ЗША, з іх выплачана 3 млрд 140 млн. «Ва ўстаноўленыя тэрміны разлічымся цалкам, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Усё, пра што дамаўляліся, мы выконваем нават на ўмовах глабальнага крызісу».

Пры гэтым, выходзячы з заявы Дэвіда Хофмана, для новай праграмы з МВФ Беларусі па-ранейшаму патрабуюцца сур'ёзныя намеры рэалізаваць комплексны пакет паслядоўных і рашучых мер макраэканамічнай палітыкі і глыбокіх структурных рэформаў, які мог бы быць падтрыманы краінамі — членамі фонду. Кіраўнік місіі МВФ адзначыў: «Калі ўлады гатовы да такіх рашучых змен сваёй цяперашняй эканамічнай палітыкі на працягу наступных месяцаў з тым, каб сфарміраваць надзейны пакет мер, МВФ гатовы пачаць працу над новай праграмай», — сказаў Дэвід Хофман.

ТАК БУДЗЕ І НАДАЛЕЙ

Прэм'ер-міністр азнаёміўся з праектам заключнай заявы МВФ і падрабязна спыніўся на некаторых ключавых пытаннях эканамічнай палітыкі, каб даць дадатковыя тлумачэнні экспертам фонду. Так, кіраўнік урада ахарактарызаваў новыя падыходы па фарміраванні і рэалізацыі дзяржаўных праграм. Місія МВФ магла пераканацца, што яны якасна ўдасканалены. Доля субсідзіраванага крэдытавання ў эканоміцы Беларусі паступова зніжаецца. Кіраўнік урада звярнуў увагу на тое, што за 9 месяцаў 2014 года рэальны рост зарплаты адпавядае тэмпам росту прадукцыйнасці працы: «І гэтага мы дасягнулі ўпершыню. Так будзе і надалей». Кіраўнік урада праінфармаваў місію аб падыходах па зніжэнні перакрыжаванага субсідзіравання, паслядоўнай рэалізацыі праграмы структурных рэформаў.

Беларусь адкрывае эканоміку для замежных інвестараў. «Тут нам вельмі патрэбна праграма з фондам. І не як грошы, а як сігнал бізнесу на актыўную працу з Беларуссю», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. «Мы гатовыя, адкрытыя для абмеркавання пытанняў і хуткасці рэформаў і іх маштабнасці, але давайце рабіць гэта ў рамках сумеснай праграмы, падрыхтоўку якой трэба было б пачаць у бліжэйшы час», — сказаў прэм'ер.

САНКЦЫІ ДАДУЦЬ НЕГАТЫЎ

Санкцыі супраць Расіі — асноўнага гандлёвага партнёра Беларусі — могуць «адбіцца праз гандлёвы канал», лічыць Дэвід Хофман. Акрамя таго, не выключана, што расійскія банкі, якія маюць даччыныя падраздзяленні ў Беларусі, пачнуць прадастаўляць ім ліквіднасць у меншых аб'ёмах. У сваю чаргу, даччыныя банкі, магчыма, будуць абмежаваны ў сваіх дзеяннях з-за санкцый. «Наколькі важнымі будуць гэтыя фактары, нам яшчэ трэба ўбачыць, але ў цэлым яны дадуць негатыўны ўплыў», — дадаў Дэвід Хофман.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ На кантролі

АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ: ЧАМУ НЕ ХАПАЕ?

Арэндная кватэра — добрая магчымасць сэканоміць грошы, бо плата за яе ў разы меншая, чым за здадзеную прыватнікамі. І дзяржаве выгадна: людзі, якія плацяць за пражыванне, папаўняюць бюджэт. Здаецца, якія могуць быць праблемы? На жаль, арэндны «алгарытм» чамусьці буксуе.

— Прэзідэнт яшчэ напрыканцы мінулага года падпісаў Указ «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін». Выканкамы да 1 красавіка гэтага года павінны былі забяспечыць фарміраванне фонду арэндnага жылля, — адзначыў **Вадзім ВАЛОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці.**

Але падчас маніторынгу высветлілася, што ў Полацкім раёне адпаведную работу правялі са спазненнем на два месяцы, і не ў поўным аб'ёме. Пасля нядаўняй праверкі кантралёры патрабавалі прызнаць на Полаччыне арэндным больш за 50 памяшканняў.

— Інфармацыю пра арэнднае жыллё адказныя асобы павінны размяшчаць на афіцыйных сайтах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. А ў дзень праверкі ў Полацкім раёне незаселенай была 71 кватэра, у тым ліку 22 — у Полацку. На афіцыйным сайце райвыканкама была размешчана інфармацыя толькі пра 17 свабодных жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання, — дадаў Вадзім Валовіч.

У Глыбоцкім раёне кантралёры ўстанавілі, што ў разрад арэндnага не перавялі кватэры ў дзвюх гаспадарках і сельскагаспадарчым філіяле. Таксама не была завершана гэтая работа і ў Талачынскім раёне.

Справаздача пра маніторынг накіравана ў Віцебскі аблвыканкам. Чыноўнікі павінны зрабіць усё для таго, каб інфармацыя пра арэндnае жыллё была даступнай, а кватэры не пуставалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Парламенцкі дзённік

Каровам ужываць чыпы?

Поўную інфармацыю пра мяса-малочныя прадукты можна будзе атрымаць у краме

Нарада па законапраекце «Аб ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі, прасочвальнасці сельскагаспадарчых жывёл, ідэнтыфікацыі і прасочвальнасці прадуктаў жывёльнага паходжання» прайшла ў Палаце прадстаўнікоў. Некалькі тыдняў таму законапраект ужо быў прыняты ў першым чытанні.

Мэта законапраекта — стварэнне нарматыўнай базы для рэгулявання пытанняў, звязаных з фарміраваннем дакладных звестак аб сельскагаспадарчых жывёлах і прадуктах жывёльнага паходжання. Адной з галоўных задач дакумента з'яўляецца вызначэнне эфектыўных спосабаў кантролю за бяспекай харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў жывёльнага паходжання.

— Канцэптуальных змен падчас падрыхтоўкі законапраекта да прыняцця ў другім чытанні не прадбачыцца, — паведаміў падчас нарады **Уладзіслаў ЦЫДЗІК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы.** — З усімі зацікаўленымі міністэрствамі — фінансаў, эканомікі, сувязі, Камітэтам па стандартызацыі, а таксама мясцовымі органамі ўлады, гэты законапраект быў узгоднены.

Прадугледжваецца, што буйная рагатая жывёла будзе мець індывідуальныя мікрачыпы, у якіх будзе ўказаны нумар кожнай асобіны. Гэты нумар не паўторыцца нават пасля смерці жывёліны. Асобны нумар будзе мець і статак.

На працягу двух гадоў пасля ўступлення ў сілу будучага закона ўласнікі сельскагаспадарчых жывёл павінны іх ідэнтыфікаваць і зарэгістраваць у дзяржаўнай інфармацыйнай сістэме.

Дзяржаўная інфармацыйная сістэма ў галіне ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі, нагляду за сельскагаспадарчымі жывёламі, а таксама за прадуктамі жывёльнага паходжання ўжо распрацавана і паэтапна ўкараняецца ў краіне. Кантроль за прадукцыяй будзе забяспечвацца, пачынаючы з нараджэння жывёлы, яе ўтрымання, харчавання, прафілактыкі і лячэння з выкарыстаннем ветэрынарных прэпаратаў і заканчваючы спосабамі яе забою, перапрацоўкі сыравіны, рэалізацыі і кантролю над якасцю і бяспекай гатовай прадукцыі.

Плануецца, што ўся карысная інфармацыя будзе змешчана ў Банку электронных пашпартоў тавараў. Любы спажывец, счытаўшы штрыхавы код на этыкетцы пры дапамозе мабільнага тэлефона, зможа праз інтэрнэт, нават знаходзячыся ў краме, атрымаць поўную інфармацыю аб паходжанні і спажывецкіх уласцівасцях прадукту. Гэты банк будзе сфарміраваны пасля ідэнтыфікацыі сельскагаспадарчых жывёл ва ўсіх раёнах краіны (а гэта 4,4 млн галоў буйной рагатай жывёлы, 1,5 млн свіней, 133 тысячы авечак і коз, а таксама 92 тыс. коней).

Працэдура электроннай ідэнтыфікацыі жывёл існуе ў свеце больш за 20 гадоў. У многіх краінах свету на базе ідэнтыфікацыі ўжо створаны сістэмы кантролю і бяспекі, таму неабходнай умовай для ўваходжання нашых суб'ектаў з беларускай прадукцыяй на гэтыя рынкі з'яўляецца адпаведнасць умовам іх працы.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■ Май на ўвазе

ЗА ПСАВАННЕ ГЛЕБЫ — МІЛЬЯРД ШТРАФУ,

альбо Да чаго прыводзіць халатнасць нядбайных

Нядаўна ў Ваўкавыскім раёне адбыўся такі выпадак. На сельскагаспадарчым прадпрыемстве вырашылі знесці старыя кароўнікі і цялятнікі разам з пад'язнымі дарогамі. Парушаныя землі меркавалася рэкультываваць, а затым увесці іх у сельскагаспадарчы абарот. Правядзеннем будаўнічых работ займалася арганізацыя, з якой быў падпісаны дагавор. Яе супрацоўнікі добра справіліся са зносам аб'ектаў, затое рэшткі асфальту і бетону яны вырашылі захаваць тут жа, на месцы былой фермы. У выніку амаль квадратны кіламетр зямлі стаў забруджаным, глеба была моцна пашкоджана. Каб разабрацца, хто ў гэтым выпадку вінаваты, мы папрасілі кіраўніка аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяну ЕЎДАСЁВУ прааналізаваць гэтае здарэнне і распавесці, як правільна абыходзіцца з адходамі.

— Першае пытанне, якое можа ўзнікнуць: а дзе можна захоўваць адходы? Адносіны ў галіне абыходжання з адходамі рэгулююцца Законам РБ «Аб абыходжанні з адходамі». У ім прапісана, што захаванне адходаў дазваляецца толькі ў санкцыяніраваных месцах: палігонах і міні-палігонах цвёрдых камунальных адходаў. У выпадку з Ваўкавыскім раёнам захаванне будаўнічых адходаў юрыдычнымі асобамі павінна праводзіцца на падставе дазволу на захаванне адходаў вытворчасці альбо комплекснага прыродаахоўнага дазволу, які выдаецца тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды. Такім чынам, будаўнічая арганізацыя павінна была звярнуцца ў Гродзенскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольля, каб унесці змены ў дазвол на захаванне адходаў. Ёй бы прызначылі месца і дазволеныя аб'ёмы адходаў для захавання.

Наступнае пытанне: хто павінен адказваць за адходы — будаўнічая арганізацыя ці сельскагаспадарчае прадпрыемства? Згодна з пунктамі 23, 30 артыкула 1 вышэйзгаданага закона, вытворцам адходаў з'яўляецца фізічная асоба, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, эканамічная дзейнасць, выніцяднасць якога прыводзіць да ўтварэння адходаў. Уласнік адходаў — гэта юрыдычная альбо фізічная асоба, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, які набыў права ўладання, карыстання і распараджэння адходамі. Згодна з законам, права ўласнасці на адходы набывае вытворца адходаў з моманту іх утварэння. У дагаворы паміж сельскагаспадарчай і будаўнічай арганізацыямі не было сказана, хто будзе з'яўляцца ўласнікам адходаў, таму ў адпаведнасці з патрабаваннямі закона ўласнікам прызнана будаўнічая арганізацыя.

Зразумела і тое, што супрацоўнікі будаўнічай арганізацыі ведалі, што нельга захоўваць адходы на месцы правядзення работ. Патрабаванні да абыходжання з адходамі прапісваюцца ў інструкцыях, дзе змяшчаецца парадак абыходжання з адходамі і пазначаюцца адказныя асобы. У нашым выпадку загад аб захаванні адходаў далі якраз адказныя асобы — галоўны інжынер і галоўны механік.

Аднак многіх, напэўна, цікавіць, што чакае правапарушальнікаў. У першую чаргу, гэта адміністрацыйная адказнасць у выглядзе папярэджання альбо штраф у памеры ад пяці да пяцідзесяці базавых, на індывідуальнага прадпрымальніка — да дзвюхсот базавых, на юрыдычную асобу — да тысячы базавых. Акрамя таго, размяшчэнне адходаў па-за санкцыянаванымі месцамі прывяло да дэградацыі зямлі і глебы — а гэта прычыненне шкоды навакольлю. Яно абыдзецца правапарушальнікам у адзін мільярд сто шэсцьдзясят мільёнаў чатырыста васямнаццаць тысяч рублёў. Зараз будаўнічая арганізацыя занята тым, што за свае сродкі праводзіць вываз адходаў з глебы і іх перавозку на палігон.

Вядома, такой сітуацыі можна было лёгка пазбегнуць, бо, нават не ведаючы, як паступіць правільна ў падобнай сітуацыі, перад пачаткам работ заўжды можна пракансультавацца ў тэрытарыяльных органах Мінпрыроды — камітэтах, гарадскіх і раённых інспекцыях прыродных рэсурсаў і аховы навакольля. Кантактныя нумары і тэлефоны ёсць на сайце міністэрства minpriroda.gov.by.

На жаль, сёння парушэнні парадку абыходжання з адходамі з'яўляюцца самымі распаўсюджанымі парушэннямі прыродаахоўнага заканадаўства, канстатуе спецыяліст Мінпрыроды.

Кацярына РАДЗЮК

■

«Ад «Звязды» я ніколі не адмаўляўся»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На яго — цеплавентылятар «Электралюкс»— спадару Шкуту пашчасціла ў апошнім са звяздоўскіх розыгрышаў. Пашчасціла, як казаў, упершыню, бо дагэтуль не выйграваў нічога... Ды і рэч, вядома ж, добрая, «у гаспадарцы патрэбная».

Адно, як высветлілася, — на выгляд дужа сціплая, асабліва — у параўнанні з дзвюма таўсценнымі папкамі са звяздоўскай «Энцыклапедыяй» парад, якія падпісчык збірае і беражліва захоўвае, пачынаючы з... 1977 года! Без малога сорак гадоў ён выпісвае газету, без малога пяцьсот файлаў (на абодва бакі) запоўніў выразкамі! А ўжо там парад ды падказак — нібы ў інтэрнэце: як знайсці месца для студні, як паправіць шыферны дах, як засцерагчы дом ад грыбка, як выбраць шпалеры і ў справу пусціць пустазелле, як прышываць гузікі, вязаць шапачкі, адмываць, адчышчаць, гатаваць ...

— Рэцэптамі найбольш карыстаецца жонка, — прызнаецца Анатоль Канстанцінавіч, — а вось астатнім цікаўлюся сам. Я чалавек не бязрукі, вясковы, — шмат што змалку ўмеў. А калі не — то заўсёды хацеў навучыцца. Бо яно ўсё ў жыцці можа спатрэбіцца: што ўмееш, за плячыма ж не носіш.

Нейкія канкрэтныя парады, узятыя ім на ўзбраенне, Анатоль Канстанцінавіч пералічваць не стаў. Заўважыў толькі, што дзякуючы «Звяздзе» ён сам сабе і маляр, і сталяр, і цясляр, і механік, і слесар... Нікога не просіць, каб, напрыклад, падшыць столь, пакласці плітку, правесці праводку, адрамантаваць машыну...

Праўда, вось гэта, апошняе, — яшчэ і таму, што па асноўнай спецыяльнасці спадар Шкут — кіроўца. Усё жыццё, як той казаў, «круціў баранку»: не здраджваў свайму «Спецкамунаўтатрансу» (35 гадоў на адным месцы!), не здраджваў сям'і, газеце і роднай мове:

— Супраць рускай я нічога не маю, — казаў Анатоль Канстанцінавіч. — Але ж не раз бываў у Прыбалтыцы, ва Украіне, і потым дужа крыўдна было: там народ свае мовы шануе — па-свойму размаўляе, а мы, беларусы, ужо нават у вёсках не хочам... Дык я хоць чытаю па-беларуску: кожны нумар «Звязды» ад радка да радка. Палітыкай цікаўлюся, здароўем, навінамі, тым, як людзі жывуць, «...Народ на провадзе» падабаецца. Таму «ад «Звязды» я ніколі ўжо не адмоўлюся.

Згадзіцеся: прыемна чуць падобныя словы, прыемна разлічваць на тое, што ў найстарэйшай беларускай газеты будуць чытачы! Бо, як прызнаўся Анатоль Канстанцінавіч, людзі з яго роду жывуць доўга. Так што ён плануе выпісваць газету гадоў да 90, як мінімум. Іншым жадае таго ж.

Хай спраўдзіцца!

Валянціна ДОЎНАР.

■ Асцярожна: спайс

«МІНЁРЫ» ПАМЫЛЯЮЦЦА АДНОЙЧЫ

Аб разбуральным уздзеянні спайсу сёння не кажа толькі лянівы. На Магілёўшчыне, на шчасце, загінулых ад гэтай атруты няма. Але 38 чалавек, якія паспрабавалі яе, прайшлі праз рэанімацыйная аддзяленні. Каб яшчэ раз перасцерагчы моладзь ад небяспечнага кроку, у Магілёве адбыўся «круглы стол», дзе суразмоўцамі студэнтаў Магілёўскага філіяла «БІП — інстытут праваznаўства» сталі прадстаўнікі ўпраўлення Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці і ўпраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці.

Аб тым, наколькі сур'ёзная гэтая пагроза, сведчаць наступныя факты. Калі ў мінулым годзе за 9 месяцаў на Магілёўшчыне была выяўлена 279 выпадкаў незаконнага абароту наркатычных сродкаў, то сёлета за такі ж перыяд — 519. Распачата 288 крымінальных спраў, звязаных з незаконным распаўсюджваннем спайсаў. Спажыўцамі курыльных сумесяў становяцца зусім маладыя людзі, якім усяго па 16-17 гадоў. Яны не разумеюць, наколькі гэта небяспечна.

— На ўзбраенні нашых экспертаў з'явілася сучаснае абсталяванне, якое дазваляе на працягу некалькіх гадзін распазнаваць падазроныя рэчывы, — паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці Валерый КАЛІН**. — Гэта дае магчымасць вельмі аператыўна заносіць новыя прэпараты ў спіс забароненых. У гэтым сэнсе мы нават апярэджваем Расію. А галоўнае, з'явілася магчымасць адразу затрымаць уладальніка курыльнай сумесі. Раней, калі экспертыза займала шмат часу, гэта было праблематычна.

Начальнік упраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Магілёўскай вобласці Мікалай КУЛІНЧЫК параўнаў чалавека, які спрабуе спайс, з мінёрам. «Тыя людзі, якія займаюцца вырабам наркатычных субстратаў, звычайна вельмі далёкія ад хіміі ў цэлым і фармакалогіі ў прыватнасці, — адзначыў ён. — Яны не думаюць аб тым, якая колькасць рэчыва будзе небяспечнай для будучага спажыўца. У іх мэты іншыя — атрымаць грошы. Іх зусім не турбуе, будзе гэта камусьці каштаваць жыцця або не».

Праваахоўнікі не выключаюць і тое, што з дапамогай спайсаў могуць здзяйсняцца дыверсіі. Уздзеянне гэтых субстратаў на мозг вельмі разбуральнае. Адбываецца «выпальванне» цэлых яго участкаў. Чалавек паступова ператвараецца ў істоту, якой вельмі лёгка кіраваць.

Начальнік упраўлення судова-псіхіятрычных экспертыз упраўлення Дзяржкамітэта судовых экспертыз Антон БАЛАШОЎ нават успомніў выпадак са сваёй практыкі, калі малады чалавек распавядаў яму аб тым, як пад уздзеяннем галюцынагенных прэпаратаў чакаў на прыпынку ў Магілёве тралейбус, а пад'ехаў цягнік метро.

Моладзь цікавіла, адкуль трапляюць у Беларусь спайсы, як праваахоўнікі змагаюцца з інтэрнэт-пастаўшчыкамі курыльных сумесяў, ці адбываецца прывыканне ад адной спробы, як развіваецца наркатычная залежнасць і наколькі цяжка ад яе пазбавіцца. На гэтыя і іншыя пытанні прагучалі падрабязныя адказы.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

ГАНАРОВАЕ КОНСУЛЬСТВА ФРАНЦЫІ АДКРЫЛІ Ў БРЭСЦЕ

Першае ў Беларусі ганаровае консульства Францыі ўрачыста адкрылі ў Брэсце. На пост ганаровага консула прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд прызначыў Леаніда Стаецкага.

— Ганаровае консульства будзе спрыяць развіццю двухбаковага супрацоўніцтва Брэсцкай вобласці і Французскай Рэспублікі ва ўсіх сферах, у тым ліку гандлёва-эканамічнай, — сказаў Леанід Стаецкі. — Асаблівы акцэнт будзе зроблены на развіццё міжкультурных адносін.

Леанід Стаецкі, вядомы ў Брэсце франкафіл, даўно падтрымлівае культурныя праекты паміж Францыяй і Беларуссю. Ён у свой час шмат зрабіў для стасункаў двух гарадоў з назвай Брэст — беларускага і французскага.

ДОСЛЕДНЫЯ ЎЧАСТКІ ЗДАВАЛІ Ў АРЭНДУ

Маларыцкі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці, як і іншыя ўстановы падобнага тыпу, мае на балансе землі для вучэбных мэт.

Мяркуецца, што на гэтых плошчах будучыя трактарысты і іншыя спецыялісты аграрнага сектара вучацца араць зямлю, апрацоўваць пасевы, збіраць ураджай. Але ці то ў ліцэя не хапіла сіл і сродкаў арганізаваць працоўнае навучанне, ці па іншай прычыне землі раздавалі насельніцтву раёна для вырошчвання бульбы. Апошняе камітэт Дзяржкантролю Брэсцкай вобласці кваліфікаваў як парушэнне заканадаўства.

Пры праверцы было выяўлена яшчэ нямала парушэнняў. У прыватнасці, неэфектыўнае расходаванне бюджэтных сродкаў, парушэнні заканадаўства ад дзяржаўнай рэгістрацыі аб'ектаў нерухомасці. На тэрыторыі навучальнай установы знайшліся нават няўлічаныя пабудовы — напрыклад, гараж на 8 адзінак транспарту.

Устаноўлены таксама сур'ёзныя хібы ў справаздачнасці. Так, сума, якую павінны кампенсаваць выпускнікі, што не пажадалі працаваць па размеркаванні, была заніжана на 51,5 мільёна рублёў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

DADOMU.BY:КОЛЬКІ ДЗЯЦЕЙ УЖО Ў СЯМ'І?

Адзіны рэспубліканскі інтэрнэт-партал www.dadomu.by адзначыў свой першы «дзень нараджэння». Ён распачаў сваю работу 14 кастрычніка 2013 года. За першы год работы партала больш за 50 тысяч чалавек мелі магчымасць атрымаць самую рознабаковую інфармацыю па пытаннях сямейнага ўладкавання дзяцей.

На момант адкрыцця на партале былі змешчаны звесткі пра 3488 дзяцей, якім патрабавалася сямейнае ўладкаванне. З выкарыстаннем прадстаўленай на партале інфармацыі 535 дзяцей набылі сем'і: з іх 215 дзяцей былі ўсыноўлены, 83 дзіцяці перададзены пад апеку, 77 непаўналетніх перададзены на выхаванне ў прыёмныя сем'і, 46 дзяцей — у дзіцячыя дамы сямейнага тыпу і 114 дзяцей былі вернуты бацькам.

Калі ў чацвёртым квартале 2013 года з дапамогай партала на сямейныя формы ўладкавання было перададзена 117 дзяцей, то за 9 месяцаў 2014 года — ужо 418 дзяцей.

Па стане на 14 кастрычніка гэтага года на партале былі прадстаўлены звесткі пра 4265 дзяцей. За год функцыянавання партал папоўніўся інфармацыяй пра 1481 дзіця, кожнае з якіх жадае быць у сям'і.

Алгарытмы формаў сямейнага ўладкавання, сістэматызаваныя і даступна пададзеныя на партале, дапамагаюць кандыдатам ва ўсынавіцелі, апекуны, патранатныя выхавальнікі і прыёмныя бацькі вызначыцца з выбарам аптымальнай формы прыёму дзіцяці ў сям'ю, а таксама спрашчаюць унутрысямейную адаптацыю пасля прыёму дзіцяці на выхаванне.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАЛЁТЫ — ПА ЗІМОВЫМ РАСКЛАДЗЕ

Авіякампанія «Белавія» перайшла на зімовы расклад палётаў, які будзе дзейнічаць да 28 сакавіка наступнага года.

У новым сезоне «Белавія» ў параўнанні з зімовым сезонам 2013-2014 года будзе выконвацца больш рэйсаў з Мінска ў Амстэрдам, Будапешт, Варшаву, Санкт-Пецярбург, Астану. З 26 кастрычніка рэйс у Кастанай будзе выконвацца круглагадзічна. «Белавія» прыняла рашэнне на перыяд навагодніх свят значна павялічыць частату выканання палётаў па найбольш запатрабаваных у турыстаў маршрутах і замяніць паветраныя судны на больш умяшчальныя.

Падчас зімовага сезона значна павялічыцца колькасць рэйсаў у рамках ужо традыцыйных чартарных праграм у Егіпет (Хургада, Шарм-эль-Шэйх). Упершыню ў зімовым сезоне будуць выконвацца рэйсы з Брэста і Гомеля ў Хургаду. У перыяд навагодніх свят беларусы змогуць паляцець з Мінска на адпачынак у Грэцыю (Салонікі), Туніс (Энфіда), Турцыю (Анталія) і Аўстрыю (Зальцбург).

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБРАБАВАНЫ ЗЛОДЗЕЙ ЗВЯРНУЎСЯ... У МІЛІЦЫЮ

У Гродне злодзей, якога абрабавалі, звярнуўся ў міліцыю, паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама.

«У Мінску мужчына ўкраў $5 тыс., 300 тыс. расійскіх рублёў і залатыя ўпрыгажэнні. Узяўшы з сабой украдзенае, ён прыехаў на сустрэчу з сябрамі ў Гродна. На здымнай кватэры ў яго падчас застолля ўкралі ўсю «здабычу». Не прыдумаўшы нічога лепшага, «пацярпелы» выклікаў супрацоўнікаў міліцыі», — расказалі ва УУС.

Аператыўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС горада Гродна падчас працы наткнуліся на заяву аб прапажы, якую ў красавіку прымалі мінскія калегі. Цяпер рабаўнік і зламыснікі, якія абакралі яго, затрыманы. Далейшы іх лёс будзе вызначаць суд.

Кар. БЕЛТА.

ХАБАР У АСАБЛІВА БУЙНЫМ ПАМЕРЫ

Следчы камітэт завёў крымінальную справу ў дачыненні да дырэктара праектна-пошукавага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут «Белчыгунпраект».

Кіраўнік прадпрыемства ўзяў амаль 100 тысяч долараў у якасці хабару ад заснавальніка і кіраўніка камерцыйных структур на спрыяльнае вырашэнне пытанняў, звязаных з прадастаўленнем аб'ёмаў работ і іх своечасовай аплатай, паведамляюць у Следчым камітэце. Атрыманы доказы таго, што ў выніку злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі дзяржаўнае прадпрыемства панесла страты ў асабліва буйным памеры. Падазроная асоба знаходзіцца пад вартай. Вядуцца следчыя дзеянні па ўстанаўленні ўсіх абставін проціпраўнай дзейнасці, праведзены вобыскі, падчас якіх канфіскавана звыш 800 тысяч долараў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

УНП 700049607

Открытое акционерное общество
«Дорожно-строительный трест № 3»
сообщает о проведении внеочередного собрания акционеров, которое состоится 31 октября 2014 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. О распределении чистой прибыли и начислении дивидендов за 9 месяцев 2014 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 31.10.2014 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.
Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 27.10.2014 г.
Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.
Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).
Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-87 —
Отдел правовой и кадровой работы. *Наблюдательный совет.*

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 6 (6)

■ За рулём

НЕ СПЯШАЙСЯ — НЕ ЗАНЯСЕ

Да 30 кастрычніка супрацоўнікі ДАІ адсочваюць практычнае навучанне ваджэнню ў аўтавучэбных арганізацыях, правяраюць стан транспартных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца апошнімі.

Усім падрыхтаваным аўтаўладальнікам Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе загадзя замяніць летнія шыны на зімовыя. Паколькі напярэдзе — не лета, то неабходна яшчэ быць вельмі асцярожнымі і памятаць пра асаблівасці ваджэння на слізкай дарозе. Некіраваны занос на слізкай дарозе і на вялікай

хуткасці часта заканчваецца аварыяй з сур'ёзнымі наступствамі. Таму лепей занос папярэдзіць, чым спадзявацца на тое, што атрымаецца выруліць з дапамогай прыёмаў контраварыйнага ваджэння (яны эфектыўныя толькі ў тым выпадку, калі адпрацаваны на пляцоўцы на працягу некалькіх гадзін). Тэарэтычныя веды аб тым, куды павярнуць колы і як маніпуляваць з педалямі газу і тормазу не дапамагаюць — у небяспечнай сітуацыі рашэнне трэба прыняць за долю секунды.

1. На пярэднепрывадным аўто пры ўваходзе ў паварот зніжайце хуткасць (знімаючы нагу з педалі газу і ўключаючы паніжаную перадачу), а пры выхадзе з яго — крыху дабаўляйце. На заднім прывадзе ў выпадку пачатку заносу дастаткова проста скінуць газ і вывернуць колы ў бок павароту.

2. Уваходзячы ў паварот на хуткасці, вышэйшай за 40 км у гадзіну, ні ў якім разе не націскайце на педаль тормазу — атрымаецца занос.

3. Калі кантроль над пярэднепрывадным аўто ўжо страчаны, дапаможа кароткачасовае скідванне газу, пасля чаго трэба газануць і крутануць рулём у бок, процілеглы заносу, і газануць.

4. Не забывайцеся на тэхнічны стан аўто і яго падрыхтоўку да эксплуатацыі ў зімовы сезон.

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Гонар мундзіра

«Хлопцаў сустракалі з шампанскім»

Каманда Міністэрства ўнутраных спраў заняла першае месца на чэмпіянаце свету па міні-футболе сярод паліцэйскіх і пажарных, які прымаў галандскі Грунла. Значнасць перамогі падкрэсляць лічбы. У турніры ўдзельнічалі 208 камандаў з 54 краін свету!

Па турнірнай сцяжыне беларусы крочылі ўпэўнена з самага пачатку. Без паражэнняў. Замінка адбылася толькі ў матчы з Ірданіяй, за якую амаль у поўным складзе выступала нацыянальная зборная па міні-футболе. Тая сустрэча завяршылася безгалявой нічыёй, а ў астатніх паядынках нашых было не стрымаць. Беларусы па чарзе расправіліся з румынамі, венграмі, чэхамі, галандцамі, дзвюма расійскімі дружынамі і ў фінале ва ўпартай барацьбе перайгралі харватаў — 1:0.

Як расказалі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні прафесійнай падрыхтоўкі МУС, базай для зборнай стала каманда «Ахова-Дынама», якая выступае ў Вышэйшай лізе першынства краіны па зальным футболе.

— Безумоўна, за іх плячыма ёсць футбольная школа, але яны працуюць у структуры нашага міністэрства і трэніруюцца, удзельнічаюць у спаборніцтвах у вольны час. Многія з нашых футбалістаў ставяцца да спорту самаахвярна. Тыя працоўныя дні, якія прапускаюць з-за спаборніцтваў, ім прыходзіцца пасля адпрацоўваць. І калі з гульні наш супрацоўнік вяртаецца дадому ў суботу познім вечарам, то ўжо ў нядзелю ён можа выйсці на дзяжурства. Шчыра кажучы, беларусам лёсаванне выбрала няпростых сапернікаў, шчыльны графік, і для нас выхад з групавой стадыі ўжо лічыўся поспехам. Аднак у хлопцаў з'явіўся сапраўдны творчы парыў. Яны прадэманстравалі выдатную камандную гульню, падтрымлівалі адзін аднаго нават у самай рызыкоўнай сітуацыі на паркеце. Асноўную ролю ў выніковай перамозе адыгралі менавіта маральна-валявыя якасці нашых футбалістаў, калектывізм. Вельмі адказна да спаборніцтваў паставіўся і міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч. Ён прысутнічаў на трэніроўках каманды, асабіста размаўляў з кожным спартсменам, і яго парады сталі вельмі карыснымі для каманды. Ён не ўмешваўся ў тактыку, падрыхтоўку, але знайшоў тыя словы, якія добра матывавалі футбалістаў.

Цікава, што ў Галандыі нашу краіну прэзентавала яшчэ адна каманда — «ветэранская». Яна ўдзельнічала ва ўзроставай катэгорыі сярод тых, каму ўжо споўнілася 35 гадоў. «Старэйшая» зборная дайшла да чвэрцьфінальнай стадыі і заняла 5-е месца. Для ветэранаў падобны вынік таксама прагрэс. Год таму ў турнірнай табліцы яны апынуліся на 9-ым радку.

— За перамогу нашы футбалісты атрымалі кубак і медалі, а на беларуска-польскай мяжы хлопцаў з шампанскім сустракалі калегі. На 29 кастрычніка запланавана таксама важнае мерапрыемства. У Дзень пазаведамаснай аховы нашы футбалісты атрымаюць узнагароды ад міністра Ігара Шуневіча.

Тарас ШЧЫРЫ

Хто гуляў?

Перамогу беларусаў у Галандыі кавалі старшы лейтэнант Аляксандр Арлоў, намеснік начальніка цэнтра фізічнай падрыхтоўкі асабістага складу ГУУС, чэмпіён краіны па міні-футболе ў складзе «Сталіцы» (2014), супрацоўнікі аддзела Дэпартамента аховы Дзмітрый Зюзько, Ілья Цыцараў, Аляксандр Крамянецкі, Аляксандр Альхавік, Уладзімір Сазонаў, Эдуард Цівуноў, Дзмітрый Філіпчык (усе — прапаршчыкі), капітан міліцыі Віталь Даўнаровіч, радавы Яўген Крэсік, лейтэнант міліцыі Аляксандр Крывашэеў і старшы лейтэнант міліцыі Аляксандр Радзькоў.

Бейсбольная біта — сродак самаабароны?

Колькі каштуюць?

Набыць сродкі самаабароны можна не толькі ў звычайных крамах, але і ў інтэрнэце. Напрыклад, кошты на газавыя балончыкі на некаторых сайтах пачынаюцца ад 80 тысяч рублёў. Электрашокеры можна набыць і за 500 тысяч, і за 2,5 мільёна (так званыя паралізатары). Звычайны ліхтарык-электрашокер кашуце 1,5 мільёна рублёў. Як відаць, усё залежыць ад фінансавых магчымасцяў і густу патэнцыйнага пакупніка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Як мне здаецца, людзі найчасцей набываюць электрашокеры і газавыя балончыкі.

— Вышэйназваныя сродкі адносяцца да зброі самаабароны, але атрымліваць дазвол на іх набыццё не трэба. Іх можна купіць на рынку, у спецыялізаваных крамах, аднак падобная прадукцыя павінна быць абавязкова сертыфікаванай.

— Які сродак самаабароны вы лічыце найбольш эфектыўным?

— Уся зброя ўяўляе для чалавека патэнцыйную пагрозу. І кожны са сродкаў пры правільным карыстанні будзе эфектыўным для ўладальніка. Пры набыцці падобнай зброі, па-першае, трэба задумацца, для чаго ты яе набываеш, а па-другое, варта зразумець, з якім сродкам самаабароны табе будзе больш зручна.

— У адрозненне ад Расіі, у нас забаронена мець і карыстацца траўматычнай зброяй.

— Так, у 2012 годзе ў Беларусі траўматычную зброю прыраўнавалі да агнястрэльнай. Яе абарачэнне ў нас цалкам забаронена.

— Ці можна да сродкаў самаабароны залічыць дубінкі і бейсбольныя біты?

— Безумоўна, нельга. Бітай трэба ў бейсбол гуляць. Проста ёсць пэўная група людзей, якая набывае і выкарыстоўвае іх не па прызначэнні.

— Дарэчы, а з якога ўзросту грамадзянін Беларусі мае права захоўваць у сябе агнястрэльную зброю?

— Паводле заканадаўства, усю зброю ў нашай краіне можна набываць з 18 гадоў. Пры выплаце дзяржаўнай пошліны ў памеры 2 базавых велічынь жыхару нашай краіны даюць дазвол на захоўванне зброі на 3 гады. Аналагічная працэдура створана для рэгістрацыі спартыўнай і паляўнічай зброі. Толькі для валодання гладкаствольнай стрэльбай варта яшчэ мець дзяржаўнае пасведчанне паляўнічага.

Між іншым, за незаконныя дзеянні ў дачыненні да газавай зброі ўладальнік можа атрымаць штраф да 10 базавых велічынь з канфіскацыяй зброі. А вось за захоўванне агнястрэльнай, самаробнай зброі чалавеку ўжо пагражае крымінальная адказнасць. За 9 месяцаў 2014 года канфіскавана 935 адзінак незарэгістраванай зброі і 1650 адзінак зарэгістраванай. Найчасцей зброю адбіраюць у чорных капальнікаў і людзей, у якіх яна засталася ад сваякоў. Варта адзначыць, што Міністэрствам унутраных спраў да 1 ліпеня праводзілася акцыя па рэгістрацыі няўлічанай зброі. Любы мог звярнуцца ў органы ўнутраных спраў, прад'явіць зброю (санкцыі не прымяняліся) і зарэгістраваць яе на сваё імя. У выніку мы дасягнулі нядрэнных паказчыкаў: у міліцыю было прынесена больш за 700 адзінак зброі.

Тарас ШЧЫРЫ.

Даведка

Зброя самаабароны — сукупнасць відаў зброі і іншых тэхнічных сродкаў, якія на законнай падставе могуць выкарыстоўвацца чалавекам для абароны жыцця і здароўя асоб, чые жыццё ці здароўе падвяргаецца пагрозе ў выніку злачыннага замаху.

■ Па-за службай

МОЦНЫ ТЫЛ — ЗАЛОГ СПАКОЮ

— Калі вырасту, адслужу ў арміі, а потым пайду працаваць у міліцыю, як бацька, — разважае сяміклясснік Дзіма Балашоў, які ў складзе сваёй сям'і стаў фіналістам рэспубліканскай акцыі «Сям'я! Служым разам!». Яго бацька Аляксей Балашоў патрулюе дарогі Рагачоўшчыны ў якасці інспектара ДАІ. Маці Алена працуе ў райвыканкаме, а таксама выкладае ў мясцовым Доме культуры. Яе ўсходнія танцы і спевы юнага Дзімы, а таксама бездакорная прафесіянальная рэпутацыя бацькі дапамаглі стаць пераможцамі ў папярэднім, абласным этапе ў Гомелі. Між тым усе, хто выйшаў у фінал, вартыя таго, каб пра іх расказваць асобна.

У Жлобін з усёй Беларусі з'ехаліся службоўцы органаў унутраных спраў у самых розных званнях. Але ўшаноўвалі міліцыянераў не за «зорачкі» на пагонах, а за сямейную еднасць, якая і жыць, і служыць дапамагае.

Свята ў горадзе металургаў пачалося яшчэ на плошчы, дзе іграў духавы аркестр ваеннай часці № 5525 унутраных войскаў МУС. Тут, на пляцоўцы ля будынка Жлобінскага гарадскога цэнтра культуры, была размешчана тэхніка Дэпартамента аховы, а побач дзеці малявалі на асфальце свае шэдэўры. Дарэчы, выстаўкі былі размешчаны і ў фае дома культуры. Тут можна было ацаніць творы юных мастакоў — пераможцаў акцыі.

Сёмы год праводзіцца мерапрыемства, якое стала часткай духоўна-асветніцкай праграмы «Сям'я — Яднанне — Айчына» Беларускай Праваслаўнай Царквы. Напярэдадні ва ўсіх абласцях у органах унутраных спраў быў праведзены адборачны этап акцыі і вызначаны самыя лепшыя. Тыя, хто і прадстаўляў свае падраздзяленні ў фінале. 13 сем'яў выйшлі на сцэну пад апладысменты глядзельнай залы і атрымалі падарункі з рук намесніка міністра ўнутраных спраў Беларусі Аляксандра Кобрусева. Ён падкрэсліў вялікую значнасць не толькі прафесійных якасцяў, але і надзейнасці міліцэйскіх сем'яў:

— З-за спецыфікі службы мы не заўсёды можам удзяліць дастаткова ўвагі родным. Таму гэтае свята — добрая падстава правесці час з дарагімі людзьмі. Сярод тых, хто выйшаў на сцэну, не ўсе служаць у міліцыі. Але ж яны з разуменнем ставяцца да складанасцяў службы. У нашым асяроддзі прыжылося паняцце «моцны тыл». Моцны тыл — гэта надзейны спадарожнік жыцця, утульнасць і спакой у доме. Служба ў органах унутраных спраў складаная і цяжкая. Яна звязана са штодзённай рызыкай і патрабуе вытрымкі і поўнай самаадданасці. Шкада, што сваякам часта дастаюцца перажыванні за нас. Але мы з вамі асэнсавана выбралі свой шлях і ўпэўнены ў падтрымцы блізкіх. У нас вельмі шмат сем'яў, дзе два-тры пакаленні служаць у органах унутраных спраў і мы такім чынам паказваем усім прыклад сямейных каштоўнасцяў.

Сям'я Аляксея і Алены Балашовых, якая прадстаўляла УУС Гомельскага аблвыканкама.

Кожная з сем'яў, што пад апладысменты падымаліся на сцэну, мела сваю «візітоўку». Вядучыя расказвалі пра чалавечыя якасці, творчыя і спартыўныя інтарэсы строгіх людзей у міліцэйскай форме. Некаторыя сем'і маюць свае традыцыі ўжо не ў адным пакаленні. Іх хапае на заняткі музыкай і рамёствамі, спевамі і танцамі. Яны і пчалярствам займаюцца, і вырошчаннем кветак, і рукадзеллем... Любяць рыбачыць-паляваць і частаваць сваякоў кулінарнымі прысмакамі. А яшчэ актыўныя ў грамадскім жыцці і спартыўных спаборніцтвах.

У межах акцыі «Сям'я! Служым разам!» былі ўшанаваны 13 пераможцаў рэгіянальных конкурсаў дзіцячага малюнка, а таксама шматдзетныя маці. Наталля Файзуліна з Лоева выхавала сямёра дзяцей, чацвёра з якіх сёння нясуць службу ў праваахоўных органах, у тым ліку два сыны — Марат і Аляксандр, падпалкоўнікі міліцыі ў Гомелі.

— У нас толькі станоўчыя эмоцыі! — дзяліліся ўдзельнікі свята сваімі ўражаннямі. — Вельмі задаволены і атмасферай, і ўвагай, і падарункамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

■ Навіны 102

УЗБРОІМСЯ ПА НАВУЦЫ

У Акадэміі МУС адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя пад назвай «Сучасныя тэхналогіі забеспячэння бяспекі», падчас якой навукоўцы і практыкі абмяркоўвалі асаблівасці ўзбраення сілавікоў.

У межах канферэнцыі ў будынку Акадэміі МУС адбывалася выстава зброі і сучасных тэхнічных сродкаў забеспячэння грамадскай бяспекі. Сярод выстаўленых экспанатаў, акрамя традыцыйных (спецадзенне, сродкаў радыяцыйнай і хімічнай абароны) было даволі шмат цікавых і незвычайных экзэмпляраў. Як, напрыклад, глушыцелі для так званых «жучкоў» (прылад падслухоўвання), якія абараняюць свайго ўладальніка ад чужых вушэй.

Галоўным жа мерапрыемствам стала сама канферэнцыя. Удзел у ёй бралі беларускія і расійскія спецыялісты, якія абмяркоўвалі шэраг пытанняў падрыхтоўкі супрацоўнікаў дзяржаўных органаў і вайскоўцаў, а таксама асаблівасці тэхнічнага забеспячэння сілавікоў. Дакладчыкі рыхтавалі працы на самыя цікавыя і актуальныя тэмы. Ішла размова, напрыклад, аб прафайлінгу — тэхналогіі назірання за людзьмі, якая дапамагае вылучыць патэнцыйна небяспечных грамадзян. Такая сістэма прымяняецца, перш за ўсё, авіякампаніямі пры аглядзе пасажыраў. Таксама прафайлінгам называюць складанне псіхалагічнага партрэта правапарушальніка пры дапамозе пакінутых ім слядоў.

— Наша мерапрыемства праводзіцца ўжо ў другі раз, у яго ёсць пэўная гісторыя, — распавёў журналістам **начальнік кафедры тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі факультэта міліцыі Акадэміі МУС падпалкоўнік міліцыі Дзмітрый ЕРМАЛОВІЧ**. — Справа ў тым, што пытанні эфектыўнасці праваахоўных органаў у асаблівых умовах дастаткова рэдка абмяркоўваюцца ў нашай краіне, спецыялістаў у гэтай сферы таксама няшмат. Акадэмія МУС дапамагае навукоўцам сабрацца, абмеркаваць найбольш актуальныя тэмы, абмяняцца досведам. Сёння геаграфія форуму пашырылася — да нас прыехалі і прывезлі свае матэрыялы на гэтую тэму спецыялісты з Расійскай Федэрацыі. Па выніках мерапрыемства складуць зборнік матэрыялаў, які адправяць усім спецыялістам у падраздзяленнях краіны.

— Мне здаецца, што ўзаемадзеянне паміж вучэбнымі арганізацыямі Беларусі і Расіі ніколі не абрывалася, — падзялілася думкамі **Улада ДЗЯВОНІНА, старшы навуковы супрацоўнік Кіраўскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў Федэральнай службы выканання пакаранняў, палкоўнік унутранай службы**. — Сёлета ў кастрычніку быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж нашым інстытутам і Акадэміяй МУС Беларусі, цяпер мы маем магчымасць ездзіць адзін да аднаго для абмену вопытам. А вопыт у кожнага свой, і ён вельмі цікавы. У беларускай Акадэміі шыкоўная матэрыяльная база, вялізны навуковы патэнцыял, гэта сапраўдны флагман працаўнікоў сілавых структур. І нам, безумоўна, ёсць чаму ў вас павучыцца.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

Не пакінулі шанцаў сапернікам

У пачатку кастрычніка ў Гродне завяршыўся 10-ы рэспубліканскі агляд-конкурс прафесійнага майстэрства сярод падраздзяленняў і супрацоўнікаў патрульна-паставой службы і АМАП органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Конкурсная праграма прадугледжвала выкананне практыкаванняў па агнявой, спецыяльнай, фізічнай і страявой падрыхтоўцы, пераадоленне паласы перашкод, хуткаснае манеўраванне на службовых аўтамабілях.

Пераможцаў і прызёраў павіншаваў намеснік міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь генерал-маёр міліцыі Мікалай Мельчанка.

У камандным першынстве па выніках агляду-конкурсу ў падгрупе падраздзяленняў ППСМ трэцяй стала каманда УУС Брэсцкага аблвыканкама, у падгрупе АМАП — каманда ГУУС Мінгарвыканкама. Кубак і дыплом другой ступені і сярод патрульных, і сярод амапаўцаў атрымала каманда УУС Віцебскага аблвыканкама. Дружына гаспадароў спаборніцтваў стала абсалютным лідарам і атрымала пераходны прыз імя С.І. Васілеўскага, а таксама службовы аўтамабіль.

Ірына ТУРОК.

Лепшага сышчыка выбралі ў Мінску

Заключны этап штогадовага агляду-конкурсу на званне «Лепшы супрацоўнік крымінальнага вышуку» адбыўся ў Акадэміі МУС.

На працягу трох дзён у навучальных аўдыторыях і на спартыўных пляцоўках галоўнай міліцэйскай ВНУ краіны разгортвалася напружаная барацьба сярод лепшых прадстаўнікоў прафесіі, вызначаных па выніках раённых і абласных адборачных тураў.

Сышчыкам неабходна было прадэманстраваць майстэрства валодання табельнай зброяй, баявымі прыёмамі барацьбы, здаць залікі па фізічнай і медыцынскай падрыхтоўцы, парадку прымянення сродкаў сувязі.

Акрамя таго, канкурсантаў чакала тэсціраванне па шэрагу дысцыплін, такіх як крымінальнае права, крымінальны працэс, крыміналогія, крыміналістыка і г.д.

Лідары спаборніцтваў атрымаюць дыпломы і граматы, а ўладальнікі прызавых месцаў — штомесячныя прэміяльныя надбаўкі і, магчыма, чарговае спецыяльнае званне датэрмінова. Іх імёны стануць вядомыя 10 лістапада. Толькі тады, у Дзень ушанавання ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў Рэспублікі Беларусь, адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды ўзнагароджання пераможцаў.

Ірына ТУРОК.

Збыць марыхуану не паспеў

Барацьбіты з нарказлачыннасцю МУС сумесна з калегамі з Ленінскага РУУС сталіцы спынілі канал распаўсюджвання марыхуаны. Для транспартавання канфіскаванага зелля давялося выкарыстоўваць грузавы аўтатранспарт.

У Мінску па падазрэнні ў распаўсюджванні наркотыкаў быў затрыманы мясцовы жыхар 1988 года нараджэння. У маладога чалавека канфіскавана каля 400 грамаў высушанай марыхуаны. Свой «тавар» ён збываў у Мінску праз праваных пакупнікоў. Затрыманы ўжо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за аналагічныя злачынствы, а яго брат да гэтага часу адбывае пакаранне за гэта.

«У мікрараёне Малінаўка затрымалі і пастаўшчыка зелля — беспрацоўнага жыхара Чачэрска Гомельскай вобласці, 1961 года нараджэння. Ён прывёз чарговую партыю для збыту, жадаючы такім чынам зноў узбагаціцца на некалькі тысяч долараў. У салоне яго аўтамабіля «БМВ» выяўлена каля 380 грамаў марыхуаны. На наступны дзень, падчас правядзення вобыску на падворку яго пажылой маці ў адной з вёсак Чачэрскага раёна знайшлі яшчэ больш за сто кілаграмаў аналагічнага наркотыку», — удакладніў начальнік аддзела ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Аляксандр Высоцкі.

Маскоўскім раённым аддзелам Следчага камітэта (г. Мінск) распачата крымінальная справа па арт. 328 КК Рэспублікі Беларусь «Незаконнае абарачэнне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў».

Пастаўшчык марыхуаны, таксама раней судзімы за распаўсюджванне канопляў, затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання ГУУС Мінгарвыканкама. На яго транспартны сродак накладзены арышт.

Віктар НОВІКАЎ.

Ператваралі людзей у рабоў

Пад Мінскам затрымалі 9 цыганоў, якіх падазраюць у незаконнай працоўнай эксплуатацыі грамадзян.

«Паводле звестак аператыўнікаў, геаграфія дзейнасці была даволі шырокай: ад Волагды да Магнітагорска, — паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС РБ. — Пад рознымі падставамі, з дапамогай значных доз алкаголю яны дастаўлялі пацярпелых у Беларусь. Пад пагрозай фізічнай расправы яны прымушалі расіян рэалізоўваць планшэты на аўтастаянках і ў іншых грамадскіх месцах Мінска і Мінскага раёна».

Ужо атрымалася ўстанавіць асобы чатырох пацярпелых. «Умовы іх пражывання можна назваць непрымальнымі, а працу — рабскай, бо працавалі яны практычна за ежу», — адзначылі ў Галоўным упраўленні па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС.

Усе напрацоўкі аператыўнікаў перададзены ў Следчы камітэт.

Тарас ШЧЫРЫ

■ Карысны атам

ЯК НЕ ВЕРЫШ ВАЧАМ, ТО ПАМАЦАЙ САМ

Карэспандэнт «Звязды» паспрабаваў высветліць усе недахопы і перавагі праекта «АЭС-2006», па якім будуецца Беларуская атамная электрастанцыя

Узгадалася мне адна размова. Пазнаёміўся аднойчы з хлопцам-аднагодкам, які працуе пілотам пасажырскіх ліній. І вельмі хацелася ў яго даведацца, ці не страшна лятаць, — столькі ж катастроф бывае... Хлопец зрэзаў маё пытанне яшчэ на палове: «Ну чаму ўсе так упэўнены, што лятаць на самалётах небяспечна? Зразумела, што рызыка ёсць, аднак калі падлічыць, колькі людзей гіне кожны год падчас аўтакатастроф, то акажацца, што лятаць больш бяспечна. Проста ўсе прызвычаіліся да таго, што падзенне самалёта — гэта сенсацыя. А ахвяры на дарогах — справа паўсядзённая». Мне здаецца, што прыкладна тая ж сітуацыя складваецца вакол выкарыстання атамнай энергетыкі. Ва ўсіх на слыху і ў памяці чарнобыльскі выбух, аварыя на японскай АЭС. У гэтым арэоле будаўніцтва атамнай станцыі на тэрыторыі нашай краіны выглядае для многіх незразумелым. І калі эканамічныя аргументы больш-менш маюць плён, то ў экалагічную бяспеку цяжка паверыць. Аднак без электрычнасці жыць сёння немагчыма. І ўвогуле: калі ўзгадаць пра авіякатастрофы, то можна па такім жа прынцыпе (не абсалютна бяспечна — значыць, не патрэбна) забараніць авіяперавозкі. Але ці разумна гэта?

БЕТОННЫЯ ГОРЫ

Факт, які маем сёння — будаўніцтва распачата, і спыняць яго нявыгадна. Трэба дабудаваць і атрымаць усе перавагі ад гэтага. У мяне ёсць жаданне высветліць узровень бяспечнасці станцыі. Ажыццявіць задуму мне дапамаглі ўдалыя абставіны: паездка на будоўлю новай Ленінградскай атамнай станцыі (ЛАЭС-2), якая ўзводзіцца па тым жа праекце, што і беларуская («АЭС-2006»). Размовы з праекціроўшчыкамі, наведванне будаўнічай пляцоўкі, самастойнае вывучэнне праекта — усім гэтым я пастараюся падзяліцца з чытачамі.

Пачну з будаўніцтва. Яшчэ калі наведваў беларускую будпляцоўку, я быў уражаны маштабам працы, неспасцігальнасцю такіх памераў для розуму, далёкага ад інжынернага. Аднак убачаныя на свае вочы амаль цалкам узведзены будынак рэактара і градзірні прымусілі задумацца аб межах чалавечых магчымасцяў. Будынак не проста вялікі, ён — магутны. Цяжка было паверыць, што гэта створана людзьмі. Думалася, што гэта нейкая гара, толькі правільнай формы і без расліннасці. А з вышыні гэтай гары відаць на некалькі кіламетраў наперад: будаўнікі дазволілі падняцца ледзь не на самы высокі пункт — каля 50 метраў (ведаю, што ёсць будынкі і больш высокія, напрыклад, градзірні па 150 метраў, аднак усё роўна пейзаж уражваў). Калі гарады называюць бетоннымі джунглямі, то АЭС — гэта бетонны горны ланцуг.

ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ?

Унутры будынка рэактара было больш утульна (калі ўвогуле можна так сказаць), але адчуванне магутнасці нікуды не знікла. Корпус рэактара ўжо недзе пада мною і ледзь заўважны паміж бетоннымі перакрыццямі. Хутка яго не будзе відаць зусім, бо ён — у самым сэрцы будынка і абкружаны парагенератарамі і іншымі неабходнымі прыстасаваннямі.

Як жа гэта ўсё працуе? Рэактар прызначаны для пераўтварэння энергіі дзялення ядзернага паліва ў цеплавую і перадачы яе цепланосьбіту першага контура. У «АЭС-2006» выкарыстаны корпусны вода-вадзяны рэактар на цеплавых нейтронах. Ён працуе з цепланосьбітам пад ціскам 16,2 МПа. Гэтым цепланосьбітам з'яўляецца вада, якая ў рэактары награваецца да 320 градусаў за кошт рэгуляванай ланцужковай рэакцыі і рухаецца пад высокім ціскам. Пакідаючы рэактар, гарачая вада праходзіць праз парагенератар. Халодная вада ў парагенератары пад уздзеяннем нагрэву ад цепланосьбіта пераўтвараецца ў пару. Яна выходзіць з парагенератара і з вялікай хуткасцю рухаецца да турбіны, якая круціцца пад яе ціскам. Механічную энергію турбіна перадае ў генератар, які знаходзіцца на адной восі з турбінай. І ён, нарэшце, выпрацоўвае электрычную энергію. Пара з турбіны, якая астыла, апускаецца ў кандэнсатар. Халодная вада з рэзервуара (спецыяльнага басейна) пераўтварае пару ў ваду ўнутры кандэнсатара. Электраэнергія, атрыманая ад генератара, праходзіць праз трансфарматарную станцыю, якая выраўноўвае напружанне, і па лініях электраперадач (ЛЭП) адпраўляецца да спажыўцоў.

НАПРУЖАНАЯ ПАБУДОВА

Трэба сказаць, што распрацоўшчыкі пастараліся ўлічыць усе магчымыя праблемныя моманты і знізіць верагоднасць іх узнікнення, асабліва па віне чалавека.

Будынак рэактара абаронены ад наступных вонкавых уздзеянняў:

— падзення самалёта;
— ураганаў, смерчаў, тарнада;
— сейсмічнай актыўнасці;
— ударнай хвалі;
— паводкі.

Тэрмін службы абсталявання станцыі, якое не замяняецца, — не менш за 60 гадоў. Праект мае ўстойлівасць да памылак персаналу, а таксама да вонкавых (прыродных і тэхнагенных) і ўнутраных уздзеянняў як пры рабоце рэактара на магутнасці, так і ў прыпыначным рэжыме. Акрамя таго, мінімізавана колькасць вытворчых адходаў, асабліва радыеактыўных.

Давайце разгледзім яшчэ раз будынак рэактара. Ён з'яўляецца асноўным будынкам АЭС, вокал якога групуюцца астатнія пабудовы «ядзернага вострава». Там размяшчаецца ядзерная паравытворная ўстаноўка і сістэмы яе аварыйнага расхалоджвання. Двайная абалонка забяспечвае максімальнае выключэнне ўплыву аварыйных выкідаў радыеактыўных прадуктаў у навакольнае асяроддзе. Больш за тое, знешняя абалонка служыць фізічнай абаронай для ўнутранай абалонкі ад усіх вонкавых уздзеянняў. Унутраная забяспечвае герметычнасць унутранага аб'ёму пры ўсіх рэжымах работы АЭС, уключаючы аварыйныя.

Дарэчы, унутраная абалонка — збудаванне з папярэдне напружанага жалезабетону (гэта будаўнічы матэрыял, прызначаны для пераадолення няздольнасці бетону супраціўляцца значным расцягвальным высілкам. Канструкцыі з папярэдне напружанага жалезабетону ў параўнанні з ненапружаным маюць значна меншыя прагіны і павышаную трэшчынастойкасць, валодаючы аднолькавай трываласцю), якое складаецца з цыліндрычнай часткі і паўсферычнага купала.

Прынцып дзеяння

Цепланосьбіт першага контуру (вада), праходзячы праз актыўную зону рэактара, награваецца і паступае ў трубную прастору парагенератара, дзе аддае сваю энергію іншай вадзе, вырабляючы пару другога контуру. Ад парагенератара цепланосьбіт вяртаецца ў рэактар для паўторнага нагрэву. Ваганні ціску кантралююцца спецыяльнымі кампенсатарамі.

Унутраная паверхня абалонкі абліцавана 6-міліметровай вугляродзістай сталлю для забеспячэння герметычнасці.

Унутраны дыяметр папярэдне напружанай абалонкі — 44 метры, таўшчыня, па разліковых звестках, складае 1,2 метра для цыліндрычнай часткі і 1 метр для купала. Да рэактаранага будынка прымыкае эстакада транспартнага шлюза, па якой ажыццяўляецца транспартаванне ў будынак рэактара буйнагабарытных грузаў.

ДАВЕДКА «Звязды»

Беларуская атамная электрастанцыя будуецца па праекце «АЭС-2006». Праект прадугледжвае наяўнасць удасканаленых вода-вадзяных рэактараў пакалення «тры плюс» павышанай надзейнасці і бяспекі. «АЭС-2006» цалкам адпавядае міжнародным нормам і рэкамендацыям МАГАТЭ. Беларуская АЭС будзе складацца з двух энергаблокаў сумарнай магутнасцю да 2400 (2х1200) МВт. Першы энергаблок плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2018 годзе, другі — у 2020-м.

Прапанаваная канструкцыя ахоўных абалонак мае большую надзейнасць у параўнанні з раней распрацаванымі канструкцыямі і з'яўляецца новым крокам у павышэнні бяспекі АЭС.

ГЛЫБОКАЯ АБАРОНА

У аснову бяспекі станцыі ў праекце закладзены прынцып глыбокаэшаланіраванай абароны. Гэта значыць, што там прымяняецца сістэма бар'ераў на шляху распаўсюджання іанізуючых выпраменьванняў і радыеактыўных рэчываў у навакольнае асяроддзе і сістэмы тэхнічных і арганізацыйных захадаў па абароне бар'ераў і захаванні іх эфектыўнасці і непасрэдна па абароне насельніцтва. Бар'еры, якія прадухіляюць выхад прадуктаў дзялення ў навакольнае асяроддзе *(гл. малюнак):*

— паліўная матрыца, якая прадухіляе выхад прадуктаў дзялення пад абалонку выдзяляльнага элементу;

— абалонка цеплавыдзяляльнага элемента, якая прадухіляе выхад прадуктаў дзялення ў цепланосьбіт галоўнага цыркулярнага контуру;

— галоўны цыркулярны контур, які прадухіляе выхад прадуктаў дзялення пад ахоўную герметычную абалонку;

— сістэма ахоўных герметычных агароджаў, якая прадухіляе выхад прадуктаў дзялення ў навакольнае асяроддзе.

Лакалізуючыя сістэмы бяспекі прызначаны для прадухілення ці абмежавання распаўсюджання ўнутры АЭС і выхаду ў навакольнае асяроддзе радыеактыўных рэчываў, якія вылучаюцца пры аварыях. Анатоль Малчанаў, галоўны інжынер кампаніі-распрацоўшчыцы «Атампраект», сцвярджае, што праект «АЭС-2006» прайшоў больш за 20 экспертыз МАГАТЭ. Асноўная яго асаблівасць — пасіўная сістэма бяспекі («пастка расплаву») у дадатак да 4-х актыўных каналаў. «Пастка» знаходзіцца пад рэактарам. У аварыйнай сітуацыі дно рэактара расплаўляецца і ўсе шкодныя рэчывы трапляюць менавіта ў гэтую «пастку».

АЎТАРСКІ НАГЛЯД

На маю думку, важна яшчэ і тое, што распрацоўшчыкі праекта «АЭС-2006» пастаянна сочаць за ўзвядзеннем нашай атамнай станцыі. І якасць будаўнічых работ на Беларускай АЭС яны лічаць вельмі высокай. «Мы вельмі задаволены ўзроўнем і падыходам да справы беларускіх будаўнікоў. Яны працуюць акуратна, дакладна прытрымліваюцца зацверджанага графіка», — гаворыць галоўны інжынер праекта Беларускай АЭС ААТ «Атампраект» Павел Бязрукаў. Прадстаўнікі ААТ «Атампраект» рэгулярна ажыццяўляюць на пляцоўцы будаўніцтва станцыі аўтарскі нагляд. У выніку робіцца выснова аб адпаведнасці будаўнічых, тэхнічных, тэхналагічных рашэнняў і дзеянняў будаўнікоў зацверджанай дакументацыі.

Акрамя таго, нядаўна дэлегацыя дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі прыняла ўдзел у якасці назіральнікаў у планавай комплекснай праверцы Ленінградскай АЭС-2, арганізаванай Растэхнаглядам. «Цікавасць спецыялістаў беларускага нагляднага органа да будоўлі менавіта гэтай расійскай станцыі не выпадковая: ЛАЭС-2 з'яўляецца аналагам Беларускай АЭС. Для станцый-аналагаў працэсы будавання, вырабу абсталявання і нагляду падобныя», — растлумачылі ў Дзяржатамнаглядзе. Асноўная каштоўнасць візіту — у атрыманні беларускімі спецыялістамі практычных навыкаў па спецыфічных пытаннях, якія складана дэталёва апісаць у кіруючых дакументах. Гэты вопыт будзе выкарыстаны для павышэння эфектыўнасці нагляду за будаўніцтвам блокаў №1 і №2 Беларускай АЭС.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.
Мінск — Санкт-Пецярбург — Мінск

■

Узвядзенне будынка рэактара.

■ Кампетэнтна

ПРАЖЫЦЬ МОЖНА І БЕЗ ГАЗУ,

а з 2019 года наша краіна спыніць імпарт электрычнасці?

Міністэрства энергетыкі працягвае працу па зніжэнні імпарту першасных энергарэсурсаў. У 2011—2015 гадах запланавана ўвесці ў эксплуатацыю 10 асноўных аб'ектаў, ад якіх плануецца атрымаць эканамічны эфект больш за 400 мільёнаў долараў ЗША. Гэта ГРЭС, ЦЭЦ, ГЭС. Вялікія надзеі таксама ўскладаюць на АЭС, першы блок якой запусцяць ужо ў 2018 годзе, што дазволіць у 2019 годзе адмовіцца ад імпарту электраэнергіі. Таксама штогод магчыма будзе замяшчаць каля 5 млрд куб. м імпартаванага прыроднага газу. У сувязі з гэтым абвастраецца пытанне ўкаранення большай колькасці сістэм, якія працуюць на электраэнергіі, як на прадпрыемствах, так і ў сферы ЖКГ.

СЭКАНОМІЦЬ НА «БЛАКІТНЫМ ПАЛІВЕ»

Адной з асноўных задач для нас з'яўляецца скарачэнне імпарту прыроднага газу. У 2013 годзе выпрацоўка энергіі беларускімі гідраэлектрастанцыямі склала 136,7 більёна кВт/гадзін, што дазволіла замясціць 33,3 млн куб. м газу.

«У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай будаўніцтва ГЭС у Беларусі плануецца пабудаваць яшчэ тры буйныя гідраэлектрастанцыі сумарнай магутнасцю больш за 80 мВт. Дзве з іх — Полацкая і Віцебская — сёння знаходзяцца ў актыўнай стадыі будаўніцтва. Таксама рэалізуюцца праекты па будаўніцтве ветраэнергетычнага парку ў Навагрудскім раёне магутнасцю да 10 мВт», — адзначыў **Уладзімір ПАТУПЧЫК, міністр энергетыкі Беларусі.**

У паліўным балансе ЖКГ 36,7% складаюць мясцовыя віды паліва, менш за 1% — топачны мазут, больш за 60% — прыродны газ. Нягледзячы на тое, што тарыфы на цеплавую энергію для насельніцтва ў 5 разоў ніжэйшыя, чым у Расіі, зніжэнне спажывання газу актыўна працягваецца. За апошнія 3 гады яно знізілася на выпрацоўку цеплавой энергіі на 3%. Аднак вядома яшчэ і тое, што ў Беларусі 27% кацельных выпрацоўваюць толькі 3% цеплавой энергіі. Сёння гэта адна з найбольш затратных частак у ЖКГ.

«Цана на прыродны газ для энергазабеспячальных арганізацый Беларусі была ў 1,7 раза вышэйшая, чым у Смаленскай вобласці Расіі ў 2013 годзе. Аднак сабекошт вытворчасці электраэнергіі застаўся практычна на тым жа ўзроўні, з розніцай у 7%. Гэта з'яўляецца яшчэ адным пацвярджэннем эфектыўнасці беларускай энергасістэмы», — падкрэсліў Уладзімір Патупчык.

ЗНІЖЭННЕ СУБСІДЗІРАВАННЯ

Цікавы і той факт, што сучасныя ўзроўні тарыфаў на электрычную і цеплавую энергію для спажыўцоў рэальнага сектара эканомікі Беларусі пакуль вышэйшыя, чым для расійскіх прамысловых спажыўцоў. Гэта абумоўлена правядзеннем праграмы сацыяльнай падтрымкі насельніцтва і рэалізуецца праз механізм перакрыжаванага субсідзіравання, калі частка выдаткаў ад аказання насельніцтву паслуг ускладзена на прамысловых спажыўцоў энергіі. Велічыня перакрыжаванага субсідзіравання па электра- і цеплаэнергіі ў 2013 годзе склала 903 млн долараў ЗША. З улікам прынятых мер сёлета аб'ём перакрыжаванага субсідзіравання знізіцца да 690 млн долараў.

Дарэчы, ужо выкарыстоўваюцца першыя беларускія паравыя катлы сярэдняй магутнасці, здольныя эфектыўна працаваць на тарфяной сыравіне. Праводзіцца планамерная рэканструкцыя і мадэрнізацыя торфабрыкетных заводаў. Арганізацыя ДВА «Белпалівагаз» штогод здабывае каля 3 млн тон торфу. Асноўная яго частка выкарыстоўваецца для вытворчасці 1,4 млн тон паліўных брыкетаў. Аднак Міністэрства энергетыкі разглядае торф не толькі як паліва, але і як сыравіну, на аснове якой можна вырабляць прадукцыю з высокім дадатковым коштам: актываваны вугаль для ачысткі вады, медыцынскія прэпараты, розныя віды комплексных угнаенняў. «Павышэнне эфектыўнасці працы беларускай энергасістэмы дазволіла часткова нівеліраваць рост цаны імпартаванага прыроднага газу. Пры росце цаны прыроднага газу ў 2013 годзе ў параўнанні з 2006-м у 3,4 раза паліўна-энергетычныя выдаткі павялічыліся толькі ў 3 разы», — растлумачыў Уладзімір Патупчык.

ПАДКЛЮЧАЕМ НОВЫЯ МАГУТНАСЦІ

Увод у эксплуатацыю высокаэфектыўных магутнасцяў дазваляе паступова скарачаць імпарт электраэнергіі. У 2012 годзе імпарт складаў каля 8 млрд кВт/гадзін, у 2013 — 6,7 млрд. Сёлета плануецца выйсці на ўзровень імпарту каля 4 млрд кВт/гадзін электраэнергіі. У 2015 годзе імпартныя закупкі скароцяцца да 2,8 млрд кВт/гадзін. У выніку рэалізацыі праграмы мадэрнізацыі ў 2006-2013 гадах Мінэнерга забяспечыла ўвод у эксплуатацыю 1242 МВт якасна новых высокаэфектыўных генерыруючых магутнасцяў з вывадам з эксплуатацыі 245 мВт састарэлых. Сэканомлена больш за 2,9 млн тон умоўнага паліва, што эквівалентна 500 млн долараў ЗША. Да 2015 года па эканоміі Міністэрства энергетыкі плануе выйсці на паказчык у 3,44 млн тон умоўнага паліва. Таксама паніжаны ўдзельны расход паліва на вытворчасць электраэнергіі да 18,5 г моўнага паліва / кВтч. Да 41% паніжаны знос асноўных фондаў. Эканамічны эфект ад рэалізацыі дзвюх дзяржаўных праграм і іншых мерапрыемстваў па ДВА «Белэнерга» ацэньваецца ў 600 млн долараў ЗША. Як адзначаюць у Мінэнерга, сёння цалкам забяспечваецца патрэбнасць краіны ў паліўна-энергетычных рэсурсах.

ЧЫМ БОЛЬШ СПАЖЫВАЕМ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ, ТЫМ БОЛЬШЫ ВУП?

У Беларусі дзейнічае мэтанакіраваная палітыка энергазберажэння. У 2018 годзе запланаваны ўвод першага блока АЭС. Гэта дазволіць выпрацоўваць уласную электраэнергію ў вялікіх аб'ёмах. Аднак інфраструктура яшчэ не гатова ўжываць столькі электрычнасці, замяніўшы ёю многія іншыя імпартуемыя віды паліва.

«У 2013 годзе спажыванне энергіі ў Беларусі склала 3600 кВт/гадзін на чалавека за год. У Швецыі гэта 14 тысяч кВт/гадзін на чалавека ў год, у Фінляндыі — больш за 15 тысяч, у Канадзе — больш за 16 тысяч. У сусветнай практыцы ёсць узаемасувязь, калі зніжалася спажыванне энергіі на чалавека ў год, то ў меншым тэмпе зніжалася спажыванне электрычнай энергіі. Сучасная сусветная тэндэнцыя, якая прасочваецца ў развітых краінах, заключаецца ў тым, што спажыванне электраэнергіі апярэджвае тэмп спажывання валавой энергіі. У Беларусі гэтая карціна, на жаль, не адпавядае сусветнай тэндэнцыі. Практычна ва ўсіх галінах, акрамя вытворчасці нафтапрадуктаў, за апошнія 4 гады спажыванне электраэнергіі ў Беларусі не павялічылася», — заявіў **Аляксандр МІХАЛЕВІЧ, навуковы кіраўнік інстытута энергетыкі НАН Беларусі.**

Варта таксама адзначыць, што хоць і цяпер у Беларусі няма павелічэння спажывання электраэнергіі, аднак у праекце новай рэдакцыі канцэпцыі энергетычнай бяспекі ўжо закладзены рост попыту на электраэнергію да 2,5% у год. Навукоўцы спадзяюцца, што ў выніку спажыванне электраэнергіі будзе перавышаць спажыванне першасных энергарэсурсаў. Таксама навукоўцы Беларусі знайшлі ўзаемасувязь росту ВУП з ростам спажывання электраэнергіі.

«Спажыванне каля 2 тысяч кВт/гадзін на душу насельніцтва ў год не дае пэўнага эфекту на рост ВУП. Аднак далей ідзе рост вытворчасці ВУП у залежнасці ад спажывання электраэнергіі на душу насельніцтва. Для таго каб выйсці на вытворчасць ВУП развітых краін, трэба дасягнуць узроўню спажывання электраэнергіі прыкладна ў 8 тыс. кВт/гадзін на чалавека ў год. Гэтая залежнасць не надта відавочная, аднак яна абумоўлена тым, што ўкараненне электраэнергіі наўзамен іншых відаў паліва — тэхналагічная рэвалюцыя, якая забяспечвае больш высокі ўзровень вытворчасці тавараў і паслуг», — падкрэсліў Аляксандр Міхалевіч.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

ЧАС «ДАМАЎЛЯЦЦА» З КАРТКАЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Расплаціцца карткай MasterCard можна больш чым у 200 краінах свету. Гэтай сістэме ў 2012 годзе належала 19% сусветнага рынку плацежных картак, а колькасць эмітаваных картак дасягнула 1,9 мільярда.

У 2010 годзе на сусветным рынку плацежных картак адбылася знамянальная падзея: карткі Visa і MasterCard, на долю якіх у пачатку трэцяга тысячагоддзя прыпадала больш за 80% сусветнага рынку, істотна пацясніла нацыянальная кітайская плацежная сістэма China UnionPay. Па выніках 2010 года, China UnionPay заняла 29,2% рынку, у той час як на долю Visa прыйшлося 28,6%. У 2012 годзе доля China UnionPay вырасла да 34% ад усіх картак, выпушчаных у абарачэнне ў свеце.

У Беларусі, як і ў Кітаі і ў многіх іншых краінах, таксама ёсць нацыянальная плацежная сістэма — БЕЛКАРТ. Паводле інфармацыі Нацыянальнага банка, доля айчыннай сістэмы на беларускім рынку па стане на 1 кастрычніка сёлета склала каля 43% (5,5 млн картак).

• Цікавы факт

Першапачаткова плацежная сістэма БЕЛКАРТ была створана на мікрапрацэсарных тэхналогіях. Усе першыя карткі сістэмы былі чыпавыя. Аднак у тыя часы асноўным носьбітам інфармацыі для картак міжнародных сістэм была магнітная паласа, і банкі Беларусі актыўна працавалі з гэтымі карткамі. У выніку адбылася тэхнічная калізія, і большасць найбуйнейшых беларускіх банкаў аказалася не ў стане абслугоўваць чыпавыя карткі БЕЛКАРТ. Па гэтай прычыне карткі БЕЛКАРТ сталі выпускацца без чыпа, але з магнітнай паласой.

Сёння Нацыянальны банк актыўна змагаецца за бяспеку безнаяўных разлікаў, і ў сувязі з гэтым з 1 ліпеня 2015 г. беларускія банкі ў абавязковым парадку пяройдуць на выпуск выключна чыпавых плацежных картак Visa і MasterCard. А з 1 студзеня 2017 года гэтае патрабаванне будзе распаўсюджвацца і на карткі плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ. Як гаворыцца, усё новае — гэта добра забытае старое.

ВЫБАР ПРАКТЫКА

Такім чынам, з плацежнымі сістэмамі мы разабраліся. Аднак адкрытым застаецца пытанне: картку якой сістэмы выбраць? Ці існуе прынцыповая розніца для трымальніка, на базе якой плацежнай сістэмы эмітавана картка?

Наш эксперт адзначае, што ўсё залежыць ад патрэб кожнага канкрэтнага чалавека. Хтосьці часта бывае за мяжой, і для яго важнае значэнне мае міжнародная функцыянальнасць. Для іншых вырашальную ролю адыгрывае бяспека, для кагосьці — зручнасць. Калі вы разумна дыверсіфіцыруеце свае рызыкі і правільна будуеце свой картачны партфель, то лепш выкарыстоўваць карткі міжнародных плацежных сістэм па іх прамым прызначэнні для правядзення аперацый за межамі Беларусі. Для замежных паездак таксама падыходзіць айчынны кабейджынгавы прадукт БелКарт-Maestro. А на тэрыторыі нашай краіны, асабліва калі гаворка ідзе пра зберагальныя карткі, дзе захоўваюцца значныя сумы, спецыялісты рэкамендуюць выкарыстоўваць БЕЛКАРТ. Трэба разумець, што бяспека правядзення аперацый па БЕЛКАРТ у дзясяткі разоў вышэйшая, чым па картках міжнародных сістэм. Звязана гэта ў першую чаргу з лакальнасцю нацыянальнай плацежнай сістэмы.

ШТО МОЖА ПЛАЦЕЖНАЯ КАРТКА?

Самая папулярная аперацыя сярод беларусаў — зняць наяўныя. Але хіба лагічна мець банкаўскую картку толькі дзеля таго, каб здымаць зарплату?

Пералічым самыя патрэбныя аперацыі, пра якія людзі звычайна забываюць. Перавод грошай з карткі на картку, заказ любых тавараў у інтэрнэт-крамах, купля квіткоў у кіно ці тэатр, браніраванне гасцініц і квіткоў на цягнікі і самалёты, аплата любых паслуг (мабільная сувязь, інтэрнэт, камунальныя паслугі праз сістэму АРІП). Для таго каб ажыццяўляць плацяжы праз АРІП, вам неабходна ведаць ідэнтыфікатар вашага плацяжу — напрыклад, нумар асабовага рахунку. Асабовы рахунак для аплаты за кватэру можна паглядзець на «жыроўцы», за электраэнергію — у старой квітанцыі аб аплаце або ўдакладніць у «Энергазбыце». Калі з дапамогай АРІП вы плануеце аплаціць пакупку ў інтэрнэт-краме, нумар асабовага рахунку вам выдасць сайт прадаўца ў момант афармлення замовы.

ЯКІ «ПЛАСТЫК» БРАЦЬ ЗА МЯЖУ

Зразумела, што картка для паездкі за мяжу павінна валодаць міжнароднай функцыяй. Тут аднолькава добра падыдуць карткі плацежных сістэм Visa і MasterCard і кабейджынгавы прадукт БелКарт-Maestro. Існуе адна слушная заўвага: — за мяжу лепш ехаць з чыпавай карткай. Па-першае, менш рызык быць падманутым ашуканцамі, па-другое — здараецца, што па картцы без чыпа адмаўляюць у абслугоўванні (што нярэдка, напрыклад, у Еўропе). Пытанне выбару пэўнага рахунку той ці іншай валюты з'яўляецца самым складаным. Трэба шукаць канверсійны варыянт менавіта для вашага маршруту. Звярніцеся ў банк, раскажыце, куды збіраецеся ехаць, і ўдакладніце, колькі прыкладна будзе складаць канверсія ў гэтай краіне ў гэтай валюце. Калі канверсійная палітыка вас не задавальняе — пабывайце ў іншых банках і падбярыце аптымальны менавіта для вас варыянт. Перад паездкай раім падключыць СМС-абвестку, каб быць у курсе ўсіх безнаяўных расходаў. І вазьміце з сабой частку наяўных грошай — пажадана не менш за 30% ад сумы, якую плануеце патраціць.

ДАВЕДКА

Па стане на пачатак кастрычніка ў Беларусі было выпушчана ў абарачэнне 12,7 млн банкаўскіх картак. Такім чынам, на аднаго чалавека па краіне прыпадае 1,3 карткі, у Мінску — больш за 2 карткі. Цяпер у краіне дзейнічае 4 268 банкаматаў, 4 544 плацежна-даведачныя тэрміналы самаабслугоўвання, у тым ліку 867 інфакіёскаў, якія былі ўстаноўлены за кошт сродкаў Белпошты. У 60 150 арганізацый гандлю (сэрвісу) функцыянуе 85 796 плацежных тэрміналаў.

Доля безнаяўных аперацый у «карткавай» сферы дасягнула 71,6% па іх колькасці і 25% па суме аперацый. На пачатак года гэтыя паказчыкі былі 68,4% і 21,5% адпаведна.

❍ ❍ ❍

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

Сяргей КУРКАЧ.

Краіна здароўя

Выпуск № 16 (327)

■ Сезонная захваральнасць

ЁН З НАМІ КРУГЛЫ ГОД

Большасць з нас ужо ведаюць, што вірусы грыпу бываюць трох тыпаў — A, B і C. Варта нагадаць, што вірусы грыпу C выклікаюць найбольш лёгкія захворванні, якія чалавек здольны перанесці, што называецца, на нагах. Вірусы грыпу A і B — прычына захворванняў больш цяжкіх. Іх звязваюць з правакацыяй штогадовых эпідэмій і больш рэдкіх пандэмій. Грып — зусім не кіраваная інфекцыя, кажуць спецыялісты. Маўляў, з-за сваёй зменлівасці (вірус хоча выжыць!) грыпозныя вірусы пастаянна становяцца нераспазнавальнымі для імуннай сістэмы. Так што людзі асуджаны хварэць штогод.

Як яго пазнаць

Уявіце, што вы ідзяце па вуліцы — актыўны і здаровы. Аднак толькі перайшлі дарогу, як ператварыліся ў старога і нямоглага. Вы раптам адчулі дрыжыкі, разбалеліся галава, вочныя яблыкі, мышцы… Вось гэта і ёсць грып. Непрыемныя характэрныя сімптомы навальваюцца раптоўна. Што да грыпападобных станаў, то іх можа выклікаць неверагодная колькасць патагенных агентаў, і не толькі вірусы, але і бактэрыі. Сярод іншых вострых рэспіраторных інфекцый у верасні гэтага года часта выяўляліся рынавірусы. А толькі іх, дарэчы, 110 тыпаў! Так што можна сабе ўявіць, колькі разоў можна «падхопліваць» насмарк.

— Вірусы грыпу найбольш актыўна цыркулююць восенню і зімой, у халодны час года, але гэта не азначае, што такога дыягназу не можа быць летам,— кажа **кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па грыпе Наталля ГРЫБКОВА.**— Як вы памятаеце, у мінулы эпідэмічны сезон не было актыўнага ўздыму рэспіраторнай захваральнасці. Такая сітуацыя назіралася наогул ва ўсіх краінах Паўночнага паўшар'я. Аднак нават ва ўмовах неактыўнай цыркуляцыі грыпу ўсё роўна былі вылучаныя вірусы грыпу ўсіх трох тыпаў (два падтыпы A і адзін B). Такая «разнастайнасць» назіраецца ў нас з 1970 года, калі пачалася цыркуляцыя адразу трох відаў вірусу. Сёлета, паводле нашага прагнозу, яны ўсе таксама будуць — два падтыпы віруса грыпу A і адзін — грыпу B.

Самая эфектыўная прафілактыка — вакцына

Яшчэ ў 1945 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя стварыла глабальную сетку назірання за грыпам. Сёння звыш 130 краін дзеляцца звесткамі аб захваральнасці на сваіх тэрыторыях, інфармацыяй аб тых вірусах, якія ўдалося вылучыць. Звесткі аналізуюцца, пасля чаго СААЗ дае рэкамендацыі па саставу вакцын для Паўночнага і Паўднёвага паўшар'яў.

На айчынным фармрынку прысутнічае некалькі вакцын замежнай вытворчасці, у тым ліку і расійскія «Грыпол» і «Грыпол плюс». Яны не даюць вельмі інтэнсіўнага развіцця імуннай рэакцыі, больш паказаны дзецям, у тым ліку немаўлятам з 6 месяцаў. У іх састаў уваходзяць імунамадулятары, якія «падцягваюць» імунітэт. «Грыпол плюс» падыходзіць і алергікам, і людзям з імунадэфіцытнымі станамі. «Ультравак» — гэта жывая вакцына, а таму выкарыстоўваецца абмежавана. Паколькі яна жывая, з наяўнасцю аслабленага віруса, то выклікае захворванне ў лёгкай форме (назіраецца, напрыклад, характэрны галаўны і мышачны боль, толькі больш слабы). Аднак у гэтай вакцыны ёсць і важная перавага. Яна спрыяе комплекснаму развіццю імунітэту (нібыта арганізм «папрацаваў» з рэальным грыпам).

Якая вакцына ідэальная?

«Не важна, хто вытворца вакцыны,— адзначае Наталля Грыбкова.— У свеце наогул не так шмат прадпрыемстваў, якія вырабляюць вакцыны супраць грыпу. Працэс жорстка кантралюецца, паколькі гэта выраб біялагічнага прэпарата, а не пашыў камізэлькі. Якасць вакцын у нас абавязкова перапраўраецца. Патрабаванні да ўсіх аднолькавыя».

Каб звесці цыркуляцыю віруса да мінімуму, неабходна вакцынаваць да 90 працэнтаў насельніцтва. У Беларусі зыходзяць у першую чаргу з таго, каб захаваць здароўе пацыентам «групы рызыкі», і таму размова ідзе пра неабходнасць прышчэплівання 40 працэнтаў насельніцтва. У папярэднія гады было крыху менш, сёння больш высокая лічба звязана з пэўным ростам усё той жа «групы рызыкі» — людзей з хранічнымі захворваннямі.

Вакцынацыя будзе праводзіцца да 1 снежня. На сёння прышчэплена толькі палова ад неабходных 40 працэнтаў.

Пра лекавыя сродкі

Яны дзеляцца на спецыфічныя і сімптаматычныя. Спецыфічныя супрацьвірусныя прэпараты — гэта **рэмантадзін, азельтамівір, рыленза, флустоп** — маюць даказаную эфектыўнасць у барацьбе з вірусам грыпу. Асноўная колькасць вірусаў грыпу A і B пакуль захоўваюць адчувальнасць да пералічаных медыкаментаў. Аднак вірусы ўсё ж такі маюць асаблівасць «прывыкаць» да прэпаратаў (другі раз могуць і не дапамагчы), а таму забараняецца выкарыстоўваць іх бескантрольна. Нельга іх прымяняць і з мэтай прафілактыкі. Сімптаматычныя лекі (антыгрыпін і інш.) таксама не рэкамендуецца прымаць, як захочацца — з-за небяспекі справакаваць пабочны эфект. А пры менінгакокавай інфекцыі (з падобнымі сімптомамі) прыём гарачкапаніжальных лекаў наогул супрацьпаказаны, паколькі можа прывесці хворага ў рэанімацыю.

■

■ Успышка эпідэміі

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА ЭБОЛА

Ліхаманка Эбола — рэдкае, але вельмі небяспечнае захворванне, з узроўнем смяротнасці ад 25 да 90 працэнтаў. У гэтую апошнюю эпідэмію колькасць інфіцыраваных дасягнула ўжо больш як 10 тысяч чалавек, звыш 4,9 тысячы загінулі. У Міністэрстве аховы здароўя Беларусі інфармацыя аб захворванні пакуль рыхтуецца (нагадаем, што эпідэмія пачалася ў сакавіку), таму звернемся да інфармацыі, якую падрыхтавалі ўжо спецыялісты іншых краін.



Першае, пра што адразу варта сказаць — гэта эпідэмія даволі малаахвярная. У 2007 годзе ўспышка ва Угандзе забрала 37 жыццяў, у 2013-м — 17. Цяпер, калі эпідэмія ліхаманкі Эбола цягнецца некалькі месяцаў, загінула каля 5 тысяч чалавек. Для параўнання: грып забірае штогод 250–300 тысяч чалавек.

Вірус Эбола, які выклікае гемарагічную ліхаманку, быў выяўлены ў двух раёнах Афрыкі (паблізу ракі Эбола, што і дало назву вірусу). Паводле афіцыйных публікацый, заразіцца можна пры цесным кантакце з крывёй, выдзяленнямі або іншымі вадкасцямі інфіцыраваных людзей. Так і ёсць: па паветры Эбола не лятае. Аднак галоўнымі прычынамі эпідэміі ў Афрыцы называюцца ўжыванне мяса шымпанзэ і арангутанаў, а таксама жудасную антысанітарыю, у якой пражывае тамтэйшае насельніцтва.

Сімптомы. Моцны галаўны боль, боль у горле і мышцах. Ваніты, дыярэя, высыпка, парушэнне функцый нырак і печані, унутраныя і знешнія крывацёкі. Аднак які фактар з'яўляецца вызначальным для смяротнасці? Той жа, што і пры халеры — абязводжванне. Гэта азначае, што хворым у першую чаргу патрэбна неабходная колькасць пітной вады, фізраствору, якія папоўняць запасы калію, магнію і г.д.

Прафілактыка. Вытрымліваць усе належныя санітарна-эпідэміялагічныя нормы. Дасканала мыць рукі. Пазбягаць цеснага фізічнага кантакту з інфіцыраванымі вірусам Эбола людзьмі. Пры доглядзе хворых карыстацца пальчаткамі, іншымі сродкамі індывідуальнай абароны.

Лячэнне. Шматлікія афіцыйныя крыніцы гавораць пра адсутнасць надзейных метадаў лячэння. Як, дарэчы, і эфектыўнай вакцыны. Маўляў, цяпер праводзяцца клінічныя выпрабаванні. Аднак нельга выпрабоўваць тое, чаго не існуе. Факт: лекі ZMapp і TKM-Ebola існуюць, але ўсё яшчэ на этапе «выпрабаванняў». Вакцыну таксама ўжо стварыла GlaxoSmithKline, адна з вядучых сусветных фармкампаній. Праўда, Сусветная арганізацыя аховы здароўя не выказала зацікаўленасці ў ёй па той простай прычыне, што «плацежаздольным краінам Эбола не пагражае», адзначае адна з замежных інфармацыйных крыніц.

Успышка. З сакавіка гэтага года ліхаманка закранула Гвінею, Ліберыю, Сьера-Леонэ, Сенегал і Нігерыю. Абсалютная большасць ахвяр — жыхары афрыканскіх краін. Аднак у верасні ў Іспаніі памёр пастар, які заразіўся вірусам у Афрыцы і быў перавезены на радзіму для лячэння. На пачатку кастрычніка была шпіталізавана адна з медсясцёр, што лячылі пастара. Яна стала першай еўрапейкай, якая заразілася вірусам па-за афрыканскім кантынентам.

«У чым праблема, чаму ліхаманка Эбола існуе ў афрыканскіх краінах?» — задаецца пытаннем замежная крыніца і дае такі адказ: «Таму што ў іх жудасная галеча і антысанітарыя. І гэта ўсяго толькі на самой справе сімптом той сацыяльнай хваробы, на якую яны хварэюць. Вось гэта мы маем. Далей мы маем міжнародную бюракратыю, якая… не можа зарэгістраваць вакцыны і лекі».

■

■ Псіхалогія для ўсіх

КАБ НЕ ЗМАГАЦЦА СА СТРЭСАМ, ЛЕПШ ЯГО НЕ ДАПУСКАЦЬ

Прыкладна кожны чацвёрты чалавек сутыкаецца з праблемай псіхічнага нездароўя на працягу жыцця

У большасці краін да 7 працэнтаў насельніцтва пакутуе ад шызафрэніі, дэменцыі, хваробы Альцгеймера, маніякальна-дэпрэсіўнага псіхозу, у 15–25 працэнтаў сустракаюцца памежныя псіхічныя расстройствы (трывога, дэпрэсія, панічныя атакі, назойлівыя станы, фобіі). Амаль палова выпадкаў нявыхаду на працу звязана менавіта з праблемамі псіхічнага здароўя. Падрабязнасці праблемы раскрывае намеснік галоўнага ўрача Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Сяргей ДАВІДОЎСКІ.

— На працягу ўсяго жыцця чалавек схільны да розных формаў псіхічных захворванняў. Так, у першыя гады жыцця можа ўзнікаць разумовая адсталасць і ранні аўтызм, затым — эпілепсія, у юнацтве — расстройства асобы і нервовая анарэксія, у маладых — шызафрэнія, панічныя расстройствы, алкагольная і іншыя залежнасці, у сярэдзіне жыцця — расстройствы настрою, у пажылых — хвароба Альцгеймера, у старасці — розныя формы дэменцыі і нейрагенератыўныя захворванні. Верагоднасць захварэць павышаецца ў першы год пасля родаў, падчас біялагічных крызаў — падлеткавым і клімактэрычным, так што ў гэты час трэба быць уважлівымі і да сябе, і да сваіх блізкіх.

Калі звярнуць увагу на афіцыйныя лічбы хворых у сталіцы, то яны акажуцца вельмі сціплымі. Аднак гэта сведчыць аб тым, што мінчане проста не звяртаюцца па дапамогу, прадузята ставяцца да псіхіятрычнай службы. Насельніцтва баіцца пастаноўкі на ўлік і звязанага з гэтым абмежавання ў правах. Аднак абмежаванне магчымае толькі ў тым выпадку, калі размова ідзе пра шызафрэнію, паранойю, эпілепсію, маніякальна-дэпрэсіўны псіхоз, дэменцыю, пры якіх парушаецца ўспрыняцце навакольля, узнікае адчуванне пагрозы свайму існаванню, нараджаецца нематываваная агрэсія да навакольных ці да сябе.

— Што ў першую чаргу спрыяе псіхічнай захваральнасці?

— Шматлікія перагрузкі. Любыя сацыяльныя і эканамічныя катаклізмы. Стрэс. Наогул стрэс (напружанне, страта раўнавагі) узнікае ў сітуацыі няпэўнага выбару. Жыццё ў гэтым сэнсе спрыяе стрэсам: непастаянныя жыццёвыя абставіны прымушаюць рабіць выбар, мяняецца і сацыяльна-эканамічная сітуацыя, а яшчэ амаль штодня здараюцца непрыемнасці на працы, нават звычайная паездка ў грамадскім транспарце можа парушыць наша нармальнае функцыянаванне. Калі мы не дасягаем поспеху, гэта пазбаўляе нас нармальнага псіхалагічнага камфорту і прыводзіць да трывожнага расстройства, дэпрэсіі і г.д.

Каб вызначыць цяжар стрэсу, неабходна ўлічыць і саму яго прыроду, і тыя рэсурсы, якія спатрэбяцца чалавеку для пераадолення. Ёсць міні-стрэсары — скажам, вы згубілі ключы. А ёсць тыя, што датычацца важных аспектаў жыцця — смерць блізкага чалавека, развод, страта працы, цяжкая хвароба. Некаторыя людзі з-за пэўных сваіх асаблівасцяў больш схільныя да стрэсу і ў большай ступені рызыкуюць сутыкнуцца з псіхічным расстройствам. Наяўнасць жа такіх рыс, як пасіўнасць, залежнасць ад іншых, заніжаная самаацэнка, педантызм, абавязковасць павышаюць верагоднасць узнікнення дэпрэсіі.

Любое расстройства асобы павышае рызыку развіцця алкагалізму і залежнасці ад іншых псіхаактыўных рэчываў.

Адным з найбольш трагічных наступстваў псіхічных расстройстваў з'яўляюцца самагубствы. У Мінску іх колькасць да нядаўняга часу перавышала колькасць памерлых ад дарожна-транспартных здарэнняў і пажараў. Беларусь доўгі час уваходзіла ў тройку краін з найбольш высокім узроўнем самагубстваў. Праўда, сёлета ў нас з'явіўся шанц выйсці з гэтай групы.

— А дзе знайсці «рэсурсы» для пераадолення самых цяжкіх стрэсавых сітуацый?

— Сапраўды, калі ў чалавека ёсць пэўны «рэсурс» для пераадолення сітуацыі, то якой бы вялікай ні аказалася праблема, яна не справакуе моцнага стрэсу і псіхічнага захворвання. Трэба разумець, што са стрэсам не варта змагацца. Лепей не дапускаць яго. І тут ёсць даволі шмат спосабаў. Гэта можа быць аўтагенная трэніроўка, медытацыя, любая фізічная нагрузка, размераны лад жыцця, наяўнасць любімага занятку, хатняга гадаванца, а часам і рэлігійнага пераканання.

— Што ўзмацняе стрэсавае ўздзеянне, робіць нас больш уразлівымі?

— Існуюць важкія доказы таго, што пазітыўныя сацыяльныя і сямейныя стасункі могуць зрабіць стрэсавае ўздзеянне ўмераным, знізіць верагоднасць захворвання і нават прадухіліць раннюю смяротнасць. А вось маці-адзіночка, бацька, які адзін выхоўвае дзіця, дый наогул чалавек, які жыве адзін,— больш уразлівыя для псіхічных захворванняў або залежнасцяў ад псіхаактыўных рэчываў.

Канфліктныя адносіны ў сям'і дакладна павышаюць рызыку развіцця не толькі расстройства паводзін у дзяцей, але і расстройства асобы ў будучыні. Калі дзіця абдзелена ўвагай, калі яго ўцягвалі ў канфлікт паміж бацькамі або яно падвяргалася гвалту, то ў яго істотна павышаюцца шанцы развіцця дэпрэсіі і трывожных расстройстваў у дарослым жыцці.

— З чаго ўсё ж такі пачаць сваё ратаванне?

— Калі чалавек сапраўды клапоціцца аб стане свайго псіхалагічнага дабрабыту, можна звярнуцца да псіхолага, псіхатэрапеўта або псіхіятра. У Мінску працуе 25 псіхатэрапеўтычных кабінетаў, размешчаных у паліклініках. Той, хто трывожыцца з-за перанесенага стрэсу або пакутуе з-за страты блізкага чалавека, можа атрымаць псіхалагічную, а калі неабходна, то і лекавую тэрапію. Падрабязную інфармацыю гатовы прадаставіць у нашым цэнтры памежных станаў (вул. Мендзялеева, 4, тэл. 245 61 74). Для аказання экстраннай псіхалагічнай дапамогі працуе «тэлефон даверу» 290 44 44 — кругласутачна і для ўсіх жыхароў краіны.

■

■ Доктар адкажа

НЕБЯСПЕКА ВЕНОЗНАГА ТРАМБОЗУ

«Тромбафлебіт і флебатрамбоз — гэта што, розныя назвы адной хваробы? Як яна лечыцца?

Аляксандр Барысавіч, г. Нясвіж»

Тлумачыць **траўматолаг-артапед 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Дзмітрый АЎХІМОВІЧ:**

— Трамбатычнае пашкоджанне вянознай сістэмы ніжніх канечнасцяў абазначаецца трыма тэрмінамі — «вянозны трамбоз», «флебатрамбоз», «тромбафлебіт». Першы тэрмін прымяняюць як асноўную назву ўсёй групы захворванняў. Тэрміны «флебатрамбоз» і «тромбафлебіт» адны ўрачы выкарыстоўваюць як сінонімы, а іншыя лічаць рознымі паняццямі, якія абазначаюць дзве розныя паталогіі.

Мяркуецца, што пры **тромбафлебіце** спачатку пашкоджваецца вянозная сценка з развіццём лакальнага запалення. Развіваецца гэта запаленне ў **падскурных** венах, і хворы гэта добра адчувае, а таму звяртаецца да ўрача. Што да вострага **флебатрамбозу** (закупоркі прасвету **глыбокай** вены), то яму можа папярэднічаць працяглы перыяд схаванага працякання захворвання — тромб фарміруецца і павялічваецца ў памеры без значных праяў для хворага. Гэта вельмі небяспечна, паколькі пагражае тромбаэмбаліяй лёгачнай артэрыі (закупоркай прасвету артэрыі, якая нясе кроў да лёгкіх).

Большасць флеболагаў разумее ўмоўнасць дзялення вянознага трамбозу і карыстаецца тэрмінам **«тромбафлебіт»** для абазначэння пашкоджання **падскурных** вен, а тэрмінам **«флебатрамбоз»** — пры пашкоджанні **глыбокіх** вен. Такім чынам, тромбафлебіт уяўляе сабой востры трамбоз падскурнай вены, які суправаджаецца асептычным (без удзелу мікраарганізмаў) запаленнем вянознай сценкі і тканак. Бывае тромбафлебіт змененых вен (варыкатрамбафлебіт — на фоне варыкозу) і нязмененых вен.

Як развіваецца вянозны трамбоз?

У развіцці тромбафлебіту вядучую ролю адыгрываюць тры фактары, якія дзейнічаюць адначасова і абцяжарваюць адзін аднаго.

1. Пашкоджанне вянознай сценкі. У выніку траўмаў, працяглай значнай вібрацыі, пасля аператыўных умяшанняў, унутрывенных ін'екцый, з-за статычных нагрузак пры стаячай працы і лішняй вагі.

2. Запавольванне руху крыві. Можа развіцца ў выпадку прыроджанай недастатковасці вянозных клапанаў, варыкознай хваробы, цяжарнасці, гіпадынаміі (малой фізічнай актыўнасці), сардэчнай недастатковасці.

3. Павышэнне згусальнасці крыві. Можа быць абумоўлена спадчыннымі асаблівасцямі арганізма або развіцца пасля ўжывання некаторых лекаў, пры абязводжванні арганізма (асабліва працяглы прыём алкаголю), пры інфекцыйных і анкалагічных захворваннях.

Калі ў месцы запалення сценкі вены запускаецца механізм згусання крыві і ўтвараецца тромб, далей можа быць два сцэнарыі. Першы — з лячэннем ці нават без яго запаленне сценкі сціхае, тромб крыху змяншаецца ў памеры, небяспека адрыву тромбу ў гэтым выпадку становіцца мінімальнай.

У другім выпадку ўтварэнне тромба і запаленне працягваюцца. Мінімальнае механічнае ўздзеянне можа прывесці да адрыву часткі тромба. З токам крыві гэты фрагмент можа закупорыць сасуды лёгкіх або галаўнога мозга, што пагражае хвораму сур'ёзнымі ўскладненнямі і нават гібеллю.

Варыкатромбафлебіт можа быць у любым участку падскурных вен, але часцей — у верхняй трэці галёнкі і ніжняй трэці сцягна.

Хранічны тромбафлебіт перыядычна абвастраецца. Востры праяўляецца агульным павышэннем тэмпературы да 38 градусаў, мясцовым моцным болем і павышэннем тэмпературы скуры, яе пачырваненнем. У гэтай зоне выяўляецца шчыльны, шнурападобны, балючы цяж — пашкоджаная вена. Калі ў працэс уцягваюцца пашыраныя вены, то варыкозныя вузлы становяцца балючымі і могуць значна павялічвацца ў памерах. Часам можа быць невялікі ацёк ніжняй канечнасці, але толькі ў вобласці пашкоджанай вены, што адрознівае гэтае захворванне ад трамбозу глыбокіх вен.

Асаблівасці лячэння

Медыкаментозная тэрапія плюс эластычнае бінтаванне (10–14 дзён кругласутачна), далей — нашэнне кампрэсійнага трыкатажу ў дзённы час.

Як правільна накласці эластычны бінт?

• Паляжыце 5–10 хвілін, узняўшы ногі ўгору. Нагу, што трэба забінтаваць, пакіньце прыўзнятай.

• Бінт накладваецца на ступню ад шчыкалаткі да пальцаў, пасля знізу ўверх бінтуюць галёнку і сцягно.

• Кожны тур бінту накладваецца з перакрыццём папярэдняга тура на 50–70 працэнтаў.

• Найбольшае нацяжэнне бінту — у вобласці шчыкалаткі, паступова змяншаецца ўгору.

• Абавязкова бінтуецца пятка, з фарміраваннем так званага «замка», што выключае саслізгванне бінту падчас хады.

• Апошні тур бінту павінен быць на 5–10 см вышэй за хворы вянозны ўчастак. Канец бінту замацоўваецца кліпсамі або бяспечнай шпількай.

Пры правільным накладванні бінту кончыкі пальцаў у спакоі трохі сінеюць, а пасля пачатку руху колер нармалізуецца. Пасля накладвання эластычнага бінту рэкамендуецца хадзіць 20–30 хвілін.

Каб не было застою крыві ў венах

Адмоўцеся ад празмернай фізічнай нагрузкі, не падымайце цяжараў.

Не стойце падоўгу без руху. Рабіце перакочванні з наскоў на пятку.

Скіньце лішнюю вагу.

Насіце абутак на нізкім абцасе (не вышэй за 4 см).

Часцей падымайцеся па лесвіцы.

Пазбягайце перагрэву — працяглых сонечных або гарачых ваннаў.

Рабіце кантрасны душ для ног.

Падчас адпачынку кладзіце ногі на ўзвышэнне (каб ступні былі на 15 см вышэй за ўзровень сэрца).

Карыснымі будуць энергічная хада (але не бег), плаванне, язда на веласіпедзе.

■

■ Новае ў свеце

ДРУГАЯ ЦЯЖАРНАСЦЬ І АЎТЫЗМ

У апошнія некалькі дзесяцігоддзяў колькасць даследаванняў прэнатальнага (перадродавага) перыяду рэзка вырасла. Што і зразумела: гэта той перыяд, які закладвае аснову здароўя (і, адпаведна, захворванняў) на ўсё астатняе жыццё. Вядома, што калі маці набірае вагу звыш нормы, то рызыка дзіцяці захварэць на дыябет узрастае; што нізкая вага пры нараджэнні можа павысіць рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў на працягу жыцця; што ўздзеянне таксінаў, уключаючы алкаголь, можа справакаваць дэфекты развіцця. Не так даўно вызначылі і яшчэ адзін цікавы момант.

У 2011 годзе вучоныя Калумбійскага ўніверсітэта высветлілі, што **верагоднасць аўтызму ў другога дзіцяці ўзрастае больш як у тры разы, калі зачацце адбылося на працягу 12 месяцаў пасля нараджэння першага.** Калі другое дзіця зачата праз 12–23 месяцы, то рызыка аўтызму павышаецца ўдвая ў параўнанні з дзецьмі, зачатымі праз тры гады і пазней.

Пакуль невядома, што з'яўляецца прычынай — недахоп спажыўных рэчываў або біяхімічныя змены, але пасля першай цяжарнасці ў арганізме жанчыны адбываецца штосьці, здольнае паўплываць на наступную цяжарнасць. Гэта адкрыццё дапаўняе іншыя даследаванні, некаторыя з якіх паказалі, што кароткія інтэрвалы паміж цяжарнасцямі могуць паўплываць на «закладванне» пэўных псіхічных хвароб — шызафрэніі, напрыклад.

Прычынай аўтызму можа быць мноства фактараў — ад генаў да навакольнага асяроддзя. Вынікі работы вучоных з Калумбійскага ўніверсітэта прадэманстравалі ўплыў навакольнага асяроддзя, які не мае нічога агульнага з генетыкай, але стварае ўмовы, што прыводзяць да гэтага дыягназу.

Паводле рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, для нараджэння здаровага дзіцяці паміж цяжарнасцямі павінна прайсці не менш за 24 месяцы.

НА ЎСЕ 20!

Можна і ў 70 адчуваць сябе, як у 20! Усяго толькі і трэба крыху больш спаць і рухацца, крыху менш есці і перажываць з-за дробязяў. Так можна адкласці «на ніколі» сардэчную недастатковасць, інсульт, атлусценне, дыябет, дэменцыю і нават рак. Вядомы амерыканскі анколаг Дэвід Агус выпусціў сёлета яшчэ адну кнігу пра тое, як захаваць здароўе і жыць доўга. Вось некаторыя з яго рэкамендацый.

✓ Чырвонае віно змяншае верагоднасць захворванняў сэрца. Жанчынам карысна выпіваць не больш за келіх, мужчынам — не больш за два ў дзень.

✓ Сокамі лепш не захапляцца. Навошта арганізму дзесяць моркавак за раз? Сок — не цэльны прадукт, паколькі ў ім няма карысных харчовых валокнаў. Калі людзі кажуць, што сок палепшыў іх самаадчуванне, насамрэч яны гавораць аб тым, што сок перашкодзіў ім з'есці фастфуд.

✓ Той прадукт, на якім няма яркай этыкеткі або звестак аб саставе, хутчэй за ўсё нармальны. Трымайцеся падалей ад прыгожа ўпакаваных бутэлек і каробак. Выключэнне — агародніна і садавіна шокавай замарозкі. Таксама памятайце пра рэкламныя хітрыкі. Калі вам даводзіцца слухаць, чаму гэта трэба есці, то не трэба гэта есці.

✓ Цела любіць прадказальнасць. Яму неабходны дакладны распарадак сну і харчавання, фізічных нагрузак і прыёму лекаў. Непастаянства правакуе ўсплёск картызолу — гармону стрэсу, які дае каманду захоўваць тлушч і энергію. Іншымі словамі, калі вы мала спіце або не ясце, то цела будзе супраціўляцца любым спробам пастрайнець.

✓ Фізічныя нагрузкі, нават звычайныя прагулкі некалькі разоў на тыдзень, абараняюць белае рэчыва мозга ад змяншэння ў любым узросце. А вось працяглае сядзенне мяняе абмен рэчываў у горшы бок, уплывае на такія параметры, як ціск, узровень гармону апетыту лептыну, глюкозы, халестэрыну. Вы можаце займацца спортам па 2 гадзіны на дзень, але калі астатнія 22 гадзіны праводзіце нерухома, гэта не палепшыць карціны. Так што, калі хочаце жыць даўжэй, уставайце і рухайцеся!

■

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Уласны погляд



ТРУТНІ

Раз-пораз з раніцы пад вокнамі чуецца скрыгат металу аб асфальт. Расшыфроўка карціны не такая ўжо і складаная: два-тры спацелыя, непаголеныя дзецюкі ў заношаных спартыўных нагавіцах цягнуць на прыёмны пункт жалеза, зрэдку — больш каштоўныя медзь альбо алюміній. Пасля рэалізацыі мэта ў іх адна — набыць у бліжэйшай краме танны алкаголь, які яны самі зневажальна называюць «бырла». П'юць дзе-небудзь паблізу, далёка ад «кропкі» не адыходзячы. Паколькі крэслаў ці лавак побач няма, некаторыя з іх садзяцца на кукішкі, нехта смокча з рыльца стоячы. Сядзяць тыя, хто меў «ходку». Звычка, прынесеная з зоны.

Гэта — адна з параўнальна бяскрыўдных разнавіднасцяў сацыяльных «трутняў», а іх даволі шмат: наркаманы, бамжы, махляры, гопнікі, гульцы казіно, шлюбныя аферысты і альфонсы, прастытуткі, крымінальнікі, інтэрнэт-ашуканцы, наркадылеры і проста лайдакі. Спіс шырокі, бо схільнасць асобных людзей да паразітычнага ладу жыцця з часам толькі расце. «Шырокі чалавек,— заўважыў некалі Фёдар Дастаеўскі,— не пашкодзіла б звузіць…».

Але як гэта зрабіць? На абарону «трутняў» адразу прымаюцца шматлікія новыя лібералы. Асноўны іх аргумент — маўляў, гэта ўціск свабоды. Але ж калі грамадства хоча быць здаровым, яно павінна неяк абмяжоўваць памкненні паразітаў жыць за яго кошт. Нават тыя ж «металазборшчыкі» пад вокнамі з іх п'яным рохканнем і мацюкамі — даволі істотны дыскамфорт. А калі ўлічыць скрадзеныя імі люкі каналізацыі, абрэзаныя кабелі электрасувязі, то як тады?

Дваццацігадовы сацыяльны трупень Пеця З., якога я ведаю, жыве непадалёк. Пакуль што ён трупень, бадай, ідэйны, але крымінальны фінал ужо прадказальны. «Бацька ніколі не працаваў, а я тым больш не збіраюся»,— аб'явіў ён сваякам. Бацька яго, які калісьці адбыў тэрмін на «малалетцы» і набраўся там «дзяшовых пантоў», завяршыў свой жыццёвы шлях даволі ганебна: п'яны падаviўся супавай косткай. Каб прывучыць да працы, яго ў выхаваўчых мэтах часам пераставалі карміць, і ў яго з'явілася дзіўная звычка: пакуль у каструлі даварваўся суп, ён цішком выцягваў адтуль костку з мясам, мяса хуценька аб'ядаў, а костку кідаў назад, у каструлю, што ўрэшце і загубіла. Пецю ж кармілі, вучылі ў школе, але далей быў збой. Хітры, як чарвяк, ён здолеў «адкасіць» ад службы ў войску, а застаўшыся ўрэшце з бабуляй, прысмактацца да яе неблагой пенсіі. Днямі ён спіць, а чым займаецца ноччу, яшчэ, пэўна, высвятляць праваахоўныя органы.

Такіх сацыяльных паразітаў рознага ўзросту, развіцця апошнім часам шмат. І бяда ў тым, што яны не проста паразітуюць на целе грамадства, а пачынаюць разбураць яго — п'янствам і, самае страшнае, распаўсюджваннем наркотыкаў. У большасці самі становяцца «нарыкамі», а тут ужо адзін крок і да сур'ёзных злачынстваў. Пражываючы ў даволі крымінальным квартале, я часта чую ў дварах іх «квакаючыя», як у Оруэла, галасы. Прысутнічаюць сярод іх і асобы жаночага полу. У таго-сяго шкляныя вочы, з рота пісягай цячэ сліна. Спайсы?

Лекары, якія часта дзяжураць у прыёмных пакоях бальніц, раскажуць вам звыклае: частка хворых — гэта псеўдахворыя: п'яныя да бяспамяцтва працаздольныя людзі абодвух палоў, наркаманы з перадазіроўкай у выглядзе анафілактычнага шоку. Альбо педыкулёзныя бамжы яшчэ не старога веку. Іх мыюць, рэанімуюць, лечаць. Яны займаюць месцы ў палатах, куды варта класці сапраўдных хворых. Хіба гэта справядліва?

Асабліва «прасунутыя» трутні палюбілі яшчэ адно згубнае наваўтварэнне — казіно. У гарадах і нават пасёлках з'явіліся яго шматлікія адгалінаванні. У выніку — гульнявая залежнасць як новая, псіхалагічная хвароба.

Яшчэ параўнальна нядаўна, пры савецкім часе, існавала крымінальная адказнасць за так званае «дармаедства». Быў у заканадаўстве і адпаведны (калі не памыляюся, 401-ы) артыкул. Абвінавачаць у дармаедстве маглі і несправядліва, чым карысталіся ў дачыненні да творчых людзей (успомнім нобелеўскага лаўрэата па літаратуры І. Бродскага) і г. д. Але выключэнні былі заўсёды, пры любых правілах. Справа цяпер у тым, што ўрэшце надышоў час надаць увагу нашым сацыяльным трутням, якія разняволіліся настолькі, што нахабна пераступаюць закон. Урэшце хітры паразіцік са спешчанымі ручкамі Пеця З. ніколі не стане нобелеўскім лаўрэатам. А вось нашкодзіць грамадству здолее напоўніцу. І Радзіму абараняць ніколі не будзе. А за вокнамі, дарэчы, стаіць пытанне рубам: калі ты малады, здаровы, не інвалід, то па якой прычыне не заняты працай?

Левыя лібералы і мультыкультуралісты адразу паказваюць на Захад. Маўляў, там беспрацоўным маладым мігрантам нават грашовыя дапамогі даюць. Але ж варта зірнуць на вынік. Банды тэрарызуюць цэлыя кварталы. Вымаранствы, наркаманія, пагроза распаду сямейных адносін і г. д.

Але ж вернемся да нашых «трутняў». Працаваць яны не хочуць і добраахвотна на такое не ўсе згодзяцца. Значыць, выйсце адно: варта іх прымушаць дзеля іх жа фізічнага і маральнага здароўя і дабрабыту. На законных падставах. Інакш — шлях да паступовай дэградацыі. Не толькі іхняй.

Юры СТАНКЕВІЧ

НАТХНЁНЫЯ ЎСХОДНЯЙ МУДРАСЦЮ

У Туркменістане беларускіх пісьменнікаў адзначылі ордэнамі Махтумкулі

У адным з мінскіх выдавецтваў на беларускай мове пабачыла свет кніга паэзіі Махтумкулі «З кубка вечнасці мёд». Адказны за яе выданне — паэт і празаік Ганад ЧАРКАЗЯН. Мы вырашылі задаць яму некалькі пытанняў.

— Чаму вы ўзяліся за такі нечаканы для Беларусі творчы праект?

— Так склалася, што ў 2012 годзе я ўдзельнічаў у міжнародным фестывалі паэзіі ў Ерэване. Туды мяне заўсёды цягне — ўсё ж такі радзіма… Рады тым знаёмствам, якія адбываюцца на такіх святах літаратуры. Звычайна стараюся такія кантакты прадоўжыць. Гэта ж цікава — ісці ў шырокі свет, ведаць, што цябе пачулі. І свае дзверы, дзверы нацыянальнага, таксама важна адкрыць для іншых мастацкіх прасцораў. У Ерэване пазнаёміўся з туркменскімі даследчыкамі літаратуры. Мяне запрасілі на юбілей Махмуда Палвана ў 2013 годзе. Паехаў у Туркменістан. Пазнаёміўшыся з новай для сябе краінай, захапіўся Каракумскім краем. Я і не ведаў, што пустыня можа так заварожваць.

— Некалі яна заваражыла Янку Сіпакова, і ў выніку нарадзіўся бліскучы мастацка-публіцыстычны нарыс. А Аркадзь Марціновіч напісаў пра Туркменістан раман «Не шукай слядоў сваіх». Барыс Мікуліч, выйшаўшы са сталінскага лагера, пісаў у Ашхабадзе «Аповесць для сябе»…

— Ведаю, што былі звязаны з Туркменістанам і іншыя нашы пісьменнікі. Васіль Ткачоў, Мікола Калінковіч, Міхась Карпенка… А мяне ўразілі новабудоўлі Ашхабада, сённяшняе развіццё гэтай сапраўды багатай краіны. Аказалася, што багатай і на шчырае стаўленне да культуры, літаратуры, гістарычнай спадчыны. Можа быць, з часам і сам нешта напішу пра Ашхабад. Мо нават ствару той жа цыкл чаргаві, вынайдзеных мною ў жаданні па-свойму падкрэсліваць у жыцці нешта сваё, тое, што толькі мне на душу кладзецца…

Там, у Туркменістане, і ўзнікла ідэя перакласці ў Беларусі паэзію Махтумкулі, выдаць асобнай кнігай у Беларусі. Туркменскі бок паабяцаў усямагчымую падтрымку.

— Але ж у нас няма, здаецца, знаўцаў туркменскай мовы…

— Туркменскія вучоныя падрыхтавалі акадэмічна выверэныя падрадкоўнікі. Кіраваў гэтай работай вядомы ў Туркменістане літаратуразнаўца Анакурбан Ашыраў. Я даведаўся, што Махтумкулі перакладалі і раней. Была ў Мінску выдадзена кніга «Салавей шукае ружу». Дакладна сцвярджаць не магу, але такое ўражанне, што перакладалі з рускіх тэкстаў.

— І гэта не самыя горшыя пераклады. Махтумкулі шмат перакладалі Арсеній Таркоўскі, Шэнгелі… А беларусы, пэўна, ішлі следам за імі, прызнанымі майстрамі перакладчыцкай справы ў рускай літаратуры…

— Ніколькі не прыніжаючы працу папярэднікаў, хачу сказаць: у кнізе «З кубка вечнасці мёд» перакладчыкі больш блізкія да арыгінала. За гэта і я, і, адпаведна, арганізатары выдання гэтай кнігі з туркменскага боку, павінны быць удзячны Казіміру Камейшу, Віктару Шніпу, Міколу Мятліцкаму, светлай памяці Рыгору Іванавічу Барадуліну…

Фота Наталлі АСМОЛЫ.

— І ён паспеў яшчэ спрычыніцца да рэалізацыі гэтага праекта?..

— Так. Рыгор Іванавіч вельмі ахвотна пагадзіўся перакладаць Махтумкулі. Калі мы сустракаліся, шмат гаварыў пра Усход. Ён жа некалі пераклаў і выдаў асобнай кнігай вершы паэтаў Кітая, Карэі, Японіі, В'етнама. Мяркую, што і ў працу над перастварэннем Махтумкулі па-беларуску ўклаў усю сваю душу, усё сваё сэрца, увесь свой талент. Нізкі паклон яму за гэта!

— У маёй памяці вельмі прыгожая кніга перакладаў Рыгора Барадуліна — «Беларусь мяне збеларушвае», у якой ён адабраў і пераўвасобіў на нашу мову вершы іншаземцаў, прысвечаныя Беларусі…

— І я памятаю гэты зборнік «Мастацкай літаратуры»… Там жа — вершы Андрэя Вазнясенскага, Яраслава Смелякова, Яўгена Еўтушэнкі, ёсць і «Самы вядомы на свеце аул» народнага паэта Туркменістана Каюма Тангрыкуліева — пра Хатынь…

— Але ж вернемся да Махтумкулі. Большасць перакладаў у новай кнізе належыць Казіміру Камейшу…

— Так. Хаця, між іншым, мы ўключылі ў выданне і ранейшыя пераклады, якія належаць Алесю Звонаку, Анатолю Клышку, Алегу Лойку, Уладзіміру Паўлаву, Уладзіміру Шахаўцу, Валянціне Коўтун, Пятру Прыходзьку, Хведару Жычку, Артуру Вольскаму. Усе яны добра вядомыя шырокаму колу чытачоў. Усе шмат працавалі на ніве перакладаў.

— Як у Туркменістане паставіліся да выдання такой прыгожай і з паліграфічнага пункту гледжання кнігі?

— Па-першае, я ўдзячны за падтрымку пасольству Туркменістана ў Беларусі, асабіста паслу Мураду Язбердыеву. У Мінску прэзентацыя кнігі прайшла ў Доме літаратара. Прыехалі на гэтае свята Махтумкулі госці з Ашхабада. Сярод іх — і народная паэтэса Туркменістана Газель Шакуліева. Яна чытала свае вершы, вершы Махтумкулі на роднай ёй туркменскай мове. Дарэчы, такія крокі пабрацімства паяднoўваюць, становяцца асновай для далейшай работы. Ведаю, што цяпер у адным з літаратурных часопісаў рыхтуюцца да выдання ўжо пераклады з паэзіі Газель Шакуліевай на беларускую мову.

— Вас запрасілі і на ўрачыстасці ў Туркменістан…

— Мы з Казімірам Камейшам удзельнічалі ў святкаванні юбілея Махтумкулі. Дарэчы, нас узнагародзілі ордэнамі Махтумкулі. Гэта як велізарную, самую дарагую ўзнагароду ў жыцці ўспрымаю. Разам з намі такой узнагародай Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў адзначыў кіраўніка ЮНЕСКА Веру Бокаву, Палада Бюль-Бюль аглы. У час святкавання віталі японскую і кітайскую перакладчыц. Туркмены правялі і адмысловае паэтычнае свята ў ашхабадскім скверы Ільхам, назва якога ў перакладзе на беларускую мову гучыць як «натхненне». І сапраўды, Ашахабад, Туркменістан натхніў нас на новае засваенне неўміручай спадчыны Махтумкулі, іншых класікаў туркменскай літаратуры.

Гутарыў Мікола МІРШЧЫНА.

■ Старонкі найноўшай гісторыі

Пераможны гамбіт Кебіча

Былы прэм'ер-міністр дакладна ведае, хто і як паводзіў сябе падчас падпісання гістарычнага дакумента

Аўтару гэтых радкоў кніга Вячаслава Кебіча «Белавежскі гамбіт», якая выйшла ў Мінску ў 2013 г., трапіла ў рукі з некаторым спазненнем. Першае ўражанне — яна вельмі адрозніваецца ад кнігі нашага аўтара «Спакушэнне ўладай», якая выйшла на 5 гадоў раней.

У першай кнізе гаворка ідзе пра падзеі з жыцця экс-прэм'ера, яна ўяўляе сабой мемуары. Трэба сказаць, што пасля распаду СССР усюды на постсавецкай прасторы выйшлі дзясяткі мемуараў актыўных удзельнікаў перабудовы і, адпаведна, распаду. Яны выклікаюць непрыемнае ўражанне, бо напоўнены нязграбнымі спробамі апраўдацца, зваліць віну на іншых, знайсці шлях да чытача, каб дабіцца апраўдання, сфарміраваць у яго пазітыўны імідж для нашчадкаў.

Біяграфічная кніга Вячаслава Кебіча «Спакушэнне ўладай» — дастаткова прыемнае выключэнне ў гэтым бясконцым шэрагу. Аўтар шчыры, катэгарычны ў сваіх ацэнках, аднак у цэлым яго аповед не пазбаўлены горычы, якую ён, відаць, востра адчуваў пасля пройгрышу на прэзідэнцкіх выбарах 1994 г. У ёй шмат і несправядлівых абвінавачанняў у адрас яго бліжэйшых супрацоўнікаў. Яму здавалася, што яны не выканалі свой абавязак да канца.

Другая кніга сур'ёзным чынам адрозніваецца па стылі выкладання, па жанры і па характары думак і ацэнак, якія прыводзяцца ў ёй. Вячаслаў Кебіч здзейсніў магутную псіхалагічную перамогу над сабой, пераадолеў горыч, і хоць, па яго прызнанні, гады пасля адстаўкі зусім не песцілі яго, на мінулае ён глядзіць з вышыні свайго досведу і мудрасці. Усяго гэтага ў яго з лішкам. Кебіч — дасведчаны дзяржаўнік, выхаванец савецкай дзяржаўнай школы, прайшоў шлях ад радавога інжынера да кіраўніка аднаго з найбуйнейшых вытворчых аб'яднанняў Савецкага Саюза. Ён набыў сур'ёзны досвед партыйнай працы, дзяржаўнага планавання ў якасці кіраўніка Дзяржплана БССР, а ў найцяжэйшыя для Беларусі 1990–1994 гг. займаў пасаду Старшыні Савета Міністраў.

Аўтар гэтага артыкула падчас перабудовы знаходзіўся ў Маскве і ведае не па чутках, якім высокім аўтарытэтам карыстаўся Вячаслаў Кебіч у цэнтральных дзяржаўных органах СССР як дасведчаны эканаміст, умелы гаспадарнік і вельмі падрыхтаваны кіраўнік кабінета міністраў. У цяжкія гады канца перабудовы, распаду СССР яму ўдалося ўмела правесці рэспубліку праз рыфы радыкальнага нацыяналізму, шматлікіх варожых партыйных аб'яднанняў, якія праналоўвалі лёгкія рэцэпты станаўлення суверэнітэту, а насамрэч — проста рваліся да ўлады. Ён захаваў жыццёвыя сувязі з Расійскай Федэрацыяй, якая таксама перажывала далёка не лепшыя часы, і наладзіў надзейны кантакт як з блізкім, так і з далёкім замежжам. Менавіта таму яго сведчанні аб ходзе перабудовы, працэсах распаду СССР набываюць асаблівую дакладнасць, бо выкладзены яны не толькі вачамі відавочцы, але і актыўнага ўдзельніка падзей.

Найбольш цікавымі ў кнізе з'яўляюцца высновы пра стан СССР, дзейнасць кіраўніцтва, і галоўная думка Кебіча гучыць, як сур'ёзнае абвінавачанне: «Адзіным фактарам, які рэальна пагражаў існаванню Савецкага Саюза, былі бяздарнасць і дагматызм яго кіраўніцтва. Дэградуючы ад лідара да лідара ў асобе Міхаіла Гарбачова, яны перарадзіліся ў ярка выяўленага калабарацыяніста, якога цікавіла толькі асабістая ўлада. Прага ўлады, самалюбаванне завалодалі ім цалкам».

У чытача, безумоўна, найбольшы інтарэс выкліча апісанне Вячаславам Кебічам працэдуры падпісання ў Віскулях у Белавежскай пушчы дакументаў, якія паклалі канец гістарычнаму існаванню СССР. Цікава адзначыць, што ініцыятарам запрашэння кіраўнікоў Расійскай Федэрацыі і Украіны быў Станіслаў Шушкевіч. Госці ехалі ў Белавежскую пушчу з цвёрдым намерам падпісаць дакумент аб адмаўленні існавання СССР, гэта значыць, яны загадзя і старанна падрыхтаваліся да гэтага. Такі дакумент быў патрэбен Барысу Ельцыну, каб «выціснуць» Міхаіла Гарбачова з Крамля, а прэзідэнту Украіны Краўчуку — каб кампенсаваць перад нацыянальна актыўнымі партыямі на Украіне сваю нядаўнюю дзейнасць у якасці хоць і не вельмі таленавітага, але шматгадовага загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП, а затым сакратара ЦК КП Украіны па ідэалогіі. Відаць, загадзя падобных намераў не меў толькі Станіслаў Шушкевіч, нядрэнны фізік, узнесены на алімп улады вірам перабудовачных падзей. Не маючы палітычнага досведу, ён паслухмяна плёўся за двума іншымі зубрамі. Апісанне палітычных інтрыг у Белавежжы, мэтай якіх была асабістая ўлада ўдзельнікаў змовы, іх маральны стан выклікае, вядома, цяжкае ўражанне. Як і іх паспешныя даклады сваім спонсарам пра «поспехі».

У новай кнізе Вячаслава Кебіча шмат фактаў, якія раней слаба асвятляліся ў мемуарнай і навукова-даследчай літаратуры, а то і зусім не вядомыя чытачу.

Цікавая рэмарка Вячаслава Кебіча, што калі Барыс Ельцын адправіўся інфармаваць прэзідэнта ЗША Буша-старэйшага, то той вельмі хутка падышоў да апарата, што азначае: ён чакаў гэтага званка. Цікава, аднак, што дакладваючы аб ліквідацыі Савецкага Саюза як палітычнага дзяржаўнага ўтварэння, Барыс Ельцын, паводле слоў аўтара кнігі, «бязбожна хлусіў». Ён зманіў амерыканскаму прэзідэнту, нібыта ў яго знаходзіцца «ядзерны чамаданчык», які ў гэты час знаходзіўся ў поўным распараджэнні прэзідэнта СССР Гарбачова. Ён сказаў Бушу няпраўду, быццам ён ужо пагутарыў аб прынятым дакуменце з прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым, чаго насамрэч не было. І, нарэшце, Барыс Ельцын падмануў Буша, паведаміўшы яму, што Гарбачоў ужо ў курсе таго, што адбылося.

Мы прыводзім гэтыя факты ўслед за Кебічам для таго, каб паказаць, якім невысокім усё ж быў маральны ўзровень новых кіраўнікоў, якімі вузкімі былі іх мэты, памкненні і палітычныя далягляды, абмежаваныя толькі жаданнем асабістай улады. Дзіўна: няўжо яны не маглі прадбачыць наступстваў? Вячаслаў Кебіч паведамляе нам пра тое, што ў 2006 г. Барыс Ельцын афіцыйна выказаў шкадаванне аб распадзе СССР. Аўтар гэтых радкоў можа дадаць: у яго ёсць інфармацыя, што ў вузкім коле падобнае шкадаванне Ельцын выказваў і раней. У мас-медыя гуляла фраза прэзідэнта Украіны Краўчука аб тым, што «нібыта ён быў гатовы адсекчы сабе руку», якая падпісвала гэтае пагадненне, калі б ведаў пра яго наступствы. Гэта каласальнае самаабвінавачанне двух палітыкаў, бо, прымаючы такія лёсавызначальныя рашэнні, яны абавязаны былі ведаць, што будзе далей. Не выказаў такога шкадавання толькі наш Шушкевіч. Наадварот, ён выкарыстоўвае сваю працздуру ўдзелу ў распадзе СССР для надання сабе сур'ёзнага іміджу палітыка. Трансфармаваўшыся з фізіка-ядзершчыка ў палітолага, ён раз'язджае з лекцыямі за мяжой, дзе «на блакітным воку» расказвае пра тое, што ён галоўная фігура, якая рыхтавала распад Савецкага Саюза задоўга да факта здзяйснення.

Горкай самакрытыкай гучыць адзін з падзагалоўкаў у кнізе В. Ф. Кебіча, што ён «сёння зрабіў бы ўсё, каб Белавежскага пагаднення не было». Ён не адзінокі ў гэтым адчуванні. Многія з людзей, якія знаходзіліся ў кіраўніцтве ў саюзных рэспубліках, сёння кажуць тое ж самае. Чаго не хапіла ім — смеласці, вопыту або ўдалай стратэгічнай пазіцыі, каб перашкодзіць трагедыі распаду,— гэта яшчэ высветліць гісторыя.

У новай кнізе Вячаслава Кебіча шмат фактаў, якія раней слаба асвятляліся ў мемуарнай і навукова-даследчай літаратуры, а то і зусім не вядомыя чытачу. У прыватнасці, заслугоўвае ўвагі інфармацыя Кебіча пра золатавалютны запас, назапашаны КПСС, які, як ён лічыць, мог бы быць размешчаны ў замежных банках і сляды якога згубіліся. Паколькі ў гісторыі не бывае нічога тайнага, што не стала б яўным, тут, відаць, нас чакаюць яшчэ немалыя адкрыцці.

Вячаслаў Кебіч бясстрашна прынцыповы ў сваіх ацэнках новага постсавецкага кіраўніцтва былых рэспублік СССР, якія атрымалі суверэнітэт. Ён жорстка папракае іх за тое, што яны не прыклалі дастатковых намаганняў, каб надаць СНД функцыянуючы патэнцыял міждзяржаўнага ўтварэння. Многія з іх паддаліся ілюзіям радыкальных нацыяналістычных груповак у сваіх краінах, нібыта кожная з гэтых рэспублік можа жыць паспяхова за кошт уласных рэсурсаў. Іншыя пачалі кідацца направа і налева, падшукваючы сабе новых сяброў і спонсараў, асабліва на Захадзе, і сталі ахвярай чужых стратэгічных мэт. Лідары ЗША і заходнееўрапейскіх краін ўдзялялі новым кіраўнікам увагу толькі пры ўмове, што яны займалі антырасійскія пазіцыі. Гэтыя антырасійскія пазіцыі «страляюць» і цяпер у СНД, перашкаджаючы стварацъ нармальныя ўмовы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

«Белавежскі гамбіт» — па сутнасці, самастойнае навуковае даследаванне, якое ахоплівае шырокае кола пытанняў сучаснай гісторыі, можа, нават занадта шырокае, што не дае аўтару магчымасці ўдзяліць належную ўвагу кожнай з сфармуляваных ім праблем постсавецкага і сусветнага развіцця. Аўтар вельмі часта цытуе сусветных класікаў ад Макіявелі да Бярдзяева, і гэта крыху лішняе, бо наўрад ці можна дапусціць, што гіганты сусветнай думкі маглі сказаць нешта, што непасрэдна адносіцца да вялікага хаосу распаду СССР.



Можна было б і больш дакладна абазначыць гістарычнае значэнне і плана Маршала, пра які згадвае экс-прэм'ер-міністр. Справа ў тым, што гэта была адначасова і істотная фінансавая падтрымка, якая дапамагла заходнееўрапейскім дзяржавам устаць на ногі пасля разбуральнай вайны, але яна вылілася ў стварэнне магутнай фінансавай сістэмы кіравання заходнім светам з адзінага цэнтра — ЗША.

Апошняе і сёння перашкаджае заходнееўрапейскім дзяржавам сфарміраваць праграмы і платформы рэформаў, якія адпавядалі б інтарэсам іх краін. Аднак, агаварыся, гэтыя прыватныя заўвагі ніяк не могуць знізіць відавочную каштоўнасць кнігі В. Ф. Кебіча, сутнасць якой у тым, што вачамі відавочцы і ўдзельніка падзей ён перадае наступным пакаленням і тую горыч, якую адчуў ён і яго калегі ад стратэгічных няўдач, і тое папярэджанне супраць легкадумных, радыкальных, псеўдарэвалюцыйных парываў усеагульнай ломкі і крушэння.

Іван АНТАНОВІЧ,
доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навук Рэспублікі Беларусь, правадзейны член Расійскай Акадэміі сацыяльных навук

ПАЛЕСКІЯ ТАЯМНІЦЫ

працягвае спасцігаць часопіс «Маладосць»

«Прысвячэнне — Яўгеніі Янішчыц, прыгоды — дэтэктыўна-архіўныя, пра буквар і каханне — анлайн; споведзь — ад езуіта», — абвяшчае вокладка дзясятага нумара «Маладосці». Інтрыгуе, ці не так? У нагрузку нагадаем, што дзясяты нумар нашага часопіса — плён чарговай незвычайнай выдумкі яе стваральнікаў: гэта другая частка міжнароднага «двухтомніка» «Планета Палессе». Першы том (дзявяты нумар), як вы памятаеце, прадстаўляў Гомельскае Палессе з удзелам братоў-украінцаў. Цяпер жа, любыя чытачы, запрашаем вас перамясціцца на захад — у ваколіцы нашага Брэста і польскіх Любліна ды Бяла-Падляскі.

Як правіла, мэта міжнародных нумароў — усталяванне творчага літаратурнага дыялогу, пашырэнне гарызонтаў… Але ў выпадку «Планеты Палессе» міжнароднасць незвычайная: ідзе гаворка пра тэрыторыі некалькіх краін, што ўтвараюць унікальную геаграфічна-культурную прастору, якую мы называем Палессем. Таму тут на першым плане — выяўленне, хутчэй, аб'яднальных, супольных рыс украінцаў, палякаў ды беларусаў пад знакам паляшуцкасці. Дзе, як не ў Любліне, студэнцкім горадзе, павінны мы шукаць лакалізацыі гэтага славянска-паляшуцкага адзінства? Таму нумар пачынаецца з апытанкі пра гэты незвычайны горад. Пасля ідзе падборка паэтычных і празаічных твораў ураджэнцаў Любліншчыны ў перакладзе на беларускую мову.

Прыгледзімся цяпер да брэсцкай часткі нашай палескай мазаікі: што «Маладосць» занатавала ў свой «Берасцейскі сшытак»? Успаміны Міхася Пазнякова пра сонечную дачку Піншчыны Яўгенію Янішчыц — раз. Інтэрв'ю з першым беларускім езуітам новага часу, ураджэнцам таго ж Пінска Віктарам Жуком, — два. Душэўная анлайн-размова з «рэйтынгавым» аўтарам «Маладосці» Валерыем Гапеевым, што жыве ў Івацэвічах, — тры. Ну і на самым пачэсным месцы, вядома, мастацкая частка: паэтычныя і празаічныя творы мастакоў слова з Берасцейшчыны. А якія менавіта — даведаецеся, пачытаўшы дзясяты нумар.

На заканчэнне пагартайце «Падляскі альбом», які ўключае «Архіўна-дэтэктыўную прыгоду, альбо Расповед пра кнігазбор, які зберагаўся ў рэкалекцыйнай келлі князёў Радзівілаў у канвенце айцоў рэфарматаў у Белай, што на Падляшшы», і мастацкую частку — зноў жа вершы і прозу братоў-палякаў у перакладзе на беларускую мову.

Тамара САРАЧЫНСКАЯ.

IdeaBank
Отличная идея!

Официальные правила Рекламной игры «Возьми кредит и выиграй Айфон 6!»

1. Настоящая рекламная игра называется «Возьми кредит и выиграй Айфон 6!» (далее по тексту – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее по тексту – «Правила») с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

Игра имеет целью стимулирование продаж в Республике Беларусь кредитных продуктов закрытого акционерного общества «Идея Банк».

2. Организатором Игры является закрытое акционерное общество «Идея Банк», зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь решением от 24 апреля 2004 года № 58 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Юридический адрес: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, д. 11, электронный адрес info@ideabank.by (далее – Организатор).

3. Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры. Состав комиссии:

Председатель:

Примачек Виктор Алексеевич, директор департамента розничного бизнеса ЗАО «Идея Банк»;

Члены Комиссии:

Хватик Николай Николаевич, начальник управления обслуживания частных клиентов ЗАО «Идея Банк»;

Олейник Александр Михайлович, начальник управления маркетинга ЗАО «Идея Банк»;

Новиков Андрей Сергеевич, директор ООО «Техномода»;

Садовская Ксения Александровна, главный экономист отдела долгосрочных проектов и партнерского сотрудничества ЗАО «Идея Банк».

4. Участником Игры может стать физическое лицо, являющееся гражданином Республики Беларусь либо имеющее вид на жительство в Республике Беларусь, выразившее путем заключения кредитного договора желание принять участие в Игре на условиях, установленных настоящими Правилами, и выполнившее условия участия в Игре.

Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

5. Для того, чтобы принять участие в Игре необходимо в период с 30 октября 2014 года по 20 января 2015 года выполнить следующие условия:

- заключить с Банком кредитный договор на условиях одного из кредитных продуктов за исключением «Специальный», «Оптимальный», «ПАЛОМА Легкий», «Технологичный», «Домовитый 3», «Домовитый 9», «Комфортный 3», «Комфортный 9», «Супер-специальный», «Экстра-специальный», «Эксклюзив Лайт», «Эксклюзив», «Электросила 4», «Электросила 5», «Электросила 6» и получить кредит согласно условиям заключенного договора;

- на момент розыгрыша призов заключенный кредитный договор должен быть действующим;

- на момент розыгрыша призов должен отсутствовать факт просрочки исполнения кредитополучателем обязательств по кредитному договору.

6. Игра проводится на территории Республики Беларусь.

Срок начала Игры – 30 октября 2014 года.

Срок окончания Игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Игры, – 30 января 2015 года.

7. Призовой фонд Игры.

В рамках Игры разыгрываются следующие Призы:

№	Наименование	Единица измерения	Кол-во	Цена за 1 ед. с НДС, бел. руб.	Всего с НДС, бел. руб.
1.	Apple iPhone 6	шт.	5	12 300 000	61 500 000

Призовой фонд Игры в размере 61 500 000 (шестьдесят один миллион пятьсот тысяч) белорусских рублей сформирован за счет имущества Организатора.

8. Права участников Игры.

Участник Игры имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами.

9. Розыгрыш Призов, определение Победителей Игры.

Розыгрыш призов осуществляется 23 января 2015 года по адресу: 220034, РБ, Минск, ул. З. Бядули, 11, в 15.00.

В розыгрыше призов принимают участие все участники Игры, при этом участники Игры, выполнившие условия настоящих Правил более одного раза, принимают участие в розыгрыше один раз.

В момент Розыгрыша призов ФИО и номер договора участника Игры распечатываются на листе формата А8, помещаются в непрозрачную коробку и перемешиваются. Представитель Комиссии путем случайной выборки листов из непрозрачной коробки последовательно определяет пять Победителей Рекламной игры, которые получат Призы.

Организатор не позднее 27 января 2015 года извещает Победителей о выигрыше заказными письмами с уведомлением по адресам, указанным в заключенных с Банком договорах.

10. Вручение Призов Победителям Игры.

Победитель может получить приз в офисе организатора по адресу: г. Минск, З. Бядули, 11 в период с 26 по 30 января 2015 года включительно.

При получении Приза Победитель должен иметь при себе действительный паспорт гражданина Республики Беларусь или иной документ, удостоверяющий личность.

11. Победитель, в случае получения Приза, уплачивает подоходный налог в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Организатор Игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением Приза и его эксплуатацией, возникшие после выдачи Приза Победителю.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, отчества, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных материалах. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

Организатор не несет ответственности за работу почтовых служб, телефонной связи и Интернета.

Участники Игры, претендующие на получение Приза, обязуются заполнить и подписать все документы, предоставляемые Организатором Игры, необходимые для получения Призов, среди прочего, согласие на разглашение сведений, содержащих банковскую тайну.

Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

В случае письменного отказа Победителя от получения Приза либо неполучения его в установленные Правилами сроки, либо нарушения Победителем настоящих Правил Приз остается у Организатора и используется по его усмотрению.

12. Информация об Игре, публикация Правил Игры.

Правила Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» не позднее 30 января 2015 года.

Дополнительно информацию об Игре можно получить по телефону: + 375 (17) 306-33-14 либо короткому номеру 7555 с мобильных с 08.00 до 20.00 или на сайте www.ideabank.by.

Свидетельство № 2456 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 27.10.2014, выданно Министерством торговли Республики Беларусь.

Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (ЗАО «Идея Банк»). Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 25 от 03.06.2013 года. УНП 807000122

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже

торгового склада (инв. № 621/С-20323) и проходной (инв. № 621/С-20322),

принадлежащих Несвижскому районному потребительскому обществу (Продавец) и расположенных по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Ленинская, 117/1,117.

Для обслуживания торгового склада и проходной Несвижскому РАЙПО предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок площадью 0,6517 га с кадастровым номером 624250100001004703.

Начальная цена с НДС – 2 477 126 400 бел. руб.
Задаток с НДС – 123 856 320 бел. руб.

Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества Несвижского РАЙПО (торговый склад и проходная), **проводимом 11 ноября 2014 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за Объект осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.

Аукцион состоится **11.11.2014 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 06.11.2014 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.03.2014.

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное предприятие
«УКС Фрунзенского района г. Минска»
(В дополнение к декларации в газете «Звязда» от 20.12.2013 № 240)

Застройщик – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, тел./факс: 204-67-99, 252-32-18.

Режим работы: 8.45–18.00, обед 13.00–14.00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Объект «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 4. 1-ая очередь строительства. Жилой дом № 2» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, **10 двухкомнатных квартир общей площадью 63,94 – 66,04 кв.м.**

Цена 1 кв.м общей площади квартиры на дату опубликования декларации сформирована в текущем уровне цен по состоянию на август 2013 года с учетом прогнозных индексов составляет **14 999 000 белорусских рублей.**

Срок ввода объекта в эксплуатацию – 15.02.2015.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;

- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

УНП 190580553

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении аукциона с условием по продаже права заключения договора аренды земельного участка

Адрес объекта и его наименование	Земельный участок для строительства и обслуживания торгового объекта в г. Мядель, ул. Партизанская. Площадь земельного участка – 0,0644 га. Кадастровый номер **624050100001001763**. Срок аренды 99 лет. **Начальная цена 91 759 825 (Девяносто один миллион семьсот пятьдесят девять тысяч восемьсот двадцать пять) белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены
Порядок оплаты	Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации, с потерями сельскохозяйственного производства. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	Заключить с Мядельским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; в установленном порядке получить архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Мядельского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство торгового объекта в срок, не превышающий двух лет; приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство торгового объекта; завершить строительство торгового объекта в сроки, определенные проектной документацией
Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Электрические сети, асфальтированный подъезд
Порядок осмотра земельного участка на местности	В рабочие дни с 8⁰⁰ до 13⁰⁰ и с 14⁰⁰ до 17⁰⁰
Условия проведения аукциона	Наличие не менее двух участников
Продавец	Мядельский районный исполнительный комитет
Организатор аукциона	Мядельский районный исполнительный комитет
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица, копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10% от начальной цены на р/с 3600623001906 ЦБУ № 619 филиала № 601 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Молодечно, код 769, УНП 600537220. Получатель платежа: Главное управление МФ РБ по Минской области, код платежа 04002.
Конечный срок и адрес приема заявок	**25 ноября 2014 г. до 16.00, г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 14, Мядельский районный исполнительный комитет, тел.: (факс) (8-01797) 55-5-73, (8-1797) 55-4-00**
Дата, время и место проведения аукциона	**28 ноября 2014 г. в 14.00, г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 36, Мядельский районный исполнительный комитет**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 01 декабря 2014 года торгов по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)	- капитальное строение с инвентарным номером 614/С-25044 площадью 229,4 кв. м (наименование: садовый домик; назначение: садовый домик), расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»; - земельный участок с кадастровым номером 624883000020000062 площадью 0,0640 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»; - земельный участок с кадастровым номером 624883000020000063 площадью 0,0488 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники».
Начальная цена	606 734 041 белорусский рубль
Сумма задатка	60 000 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 01 декабря 2014 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 30.10.2014 по 27.11.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
2 декабря 2014 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей)
Лот № 1	Озерский с/Совет	аг. Озеро, ул. Аэродромная, уч. 62	0,1500	625682508601000761	79 000 000	8 455 450
Лот № 2	Озерский с/Совет	аг. Озеро, ул. Луговая, уч. 34	0,1500	625682508601000668	79 000 000	8 455 450
Лот № 3	Озерский с/Совет	аг. Озеро, ул. Луговая, уч. 35	0,1500	625682508601000777	79 000 000	8 455 450
Лот № 4	Озерский с/Совет	аг. Озеро, ул. Луговая, уч. 37	0,1500	625682508601000730	79 000 000	8 455 450
Лот № 5	Дещенский с/Совет	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 17	0,1500	625680202201000260	60 000 000	8 246 100

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению.

На повторные торги выставляются:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей)
Лот № 6	Дещенский с/Совет	д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. 30	0,1500	625680211801000073	55 000 000	4 911 500
Лот № 7	Слободской с/Совет	д. Кривели, ул. Школьная, уч. 19	0,0918	625683205601000087	50 000 000	6 603 200

Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Участок в д. Кривели находится в живописном месте рядом с Лошанским водохранилищем, имеется возможность подключения к электроснабжению и водоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа – 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 26 ноября 2014 года включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

